КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 16 (1142) 19 красавіка 2014 г.

З Вялікаднем, хрысціяне!

Беларусь наведвае дырэктар UNESCO С. 2

Фестываль мусіць быць... якім? С. 5

Калі трэба **пачынаць аптымізацыю?** С. 10 — 11

Чалавек, які разгадаў абрад "Страла" С. 6

Напярэдадні адкрыцця выставачнага праекта "Avant-gARTe. Ад квадрата да аб'екта" журналісты "Культуры" падрыхтавалі F.A.Q. па канцэпцыі і напаўненні ўсіх трох задзейнічаных пляцовак, а таксама пабачылі "кухню" творчай акцыі, калі асістэнты асноўнага куратара па пэўных частках экспазіцыі здзяйснялі іх насычэнне экспанатамі...

КОЛА АВАНГАРДА: БЕЛАРУСКАЯ ВЕРСІЯ

С. 8 — 9

Ідзе мантаж экспазіцыі ў выставачным павільёне на сталічным праспекце Пераможцаў, 14. / Фота Юрыя ІВАНОВА

УВАГА! / ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" / ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ІНДЭКС — 63875 ВЕДАМАСНЫ ІНДЭКС — 638752

Соцыум

Пано Савіцкага пойдзе ў сховішча

Засталося няшмат часу да таго моманту, калі Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адсвяткуе наваселле ў спецыяльна для яго ўзведзеным будынку на праспекце Пераможцаў, які мае стаць адной з архітэктурных славутасцей сталіцы. А што будзе з творамі мастацтва, якіх у фондах музея недзе 5 000 адзінак захоўвання? Пра гэта спрабаваў даведацца наш карэспандэнт.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Так, мо каму і шкада, што музей пакідае "намоленыя" сцены ў самым цэнтры сталіцы. Але відавочна, што ў новым гмаху ўмовы для разгортвання экспазіцыі ды захоўвання гістарычных рэліквій лепшыя. Да таго ж вакол музея раскінуўся парк Перамогі, які разам з ім утварае адзіны мемарыяльна-прасторавы комплекс.

З усім скарбам

Аднак кожны, каму хоць раз даводзілася змяняць "прапіску" ды пераязджаць з усім скарбам на новае месца, ведае, якіх высілкаў гэта каштуе і колькі праблем пры гэтым узнікае. Вось і нашым чытачам цікава, як у сваім новым доме музейшчыкі "расставяць мэблю". У прыватнасці, ці знойдзецца ў экспазіцыі месца творам мастацтва, якіх у фондах музея недзе 5 000 адзінак захоўвання; што будзе з манументальнай аздобай "старога" будынка, у прыватнасці, з роспісам "Вялікая Айчынная вайна" работы Міхаіла Савіцкага; што за лёс чакае дыярраму, створаную ў 1970-х гадах беларускімі мастакамі, якую летась замянілі новай — аўтарства мастакоў Студыі імя М.Грэкава?

Тлумачэнні па гэтых пытаннях мы атрымалі ад намесніка дырэктара музея па навуцы Ганны Галінскай. Найперш спадарыня Галінская супакоіла нас адносна лёсу мастацкай калекцыі: усё перавязуць у сховішчы новага гмаху, і нейкая частка тых твораў будзе прадстаўлена ў экспазіцыі. Іншыя ж грамада зможа пабачыць на выстаўках, якіх у музеі праходзіла нямала і якія маюць ладзіцца і надалей.

Жывапіснае пано работы Міхаіла Савіцкага будзе дэмантавана і таксама перавезена ў новы будынак. Але пакуль — толькі ў сховішча. Там ім, калі спатрэбіцца, зоймуцца рэстаўратары. У экспазіцыі, якая адкрыецца 3 ліпеня, для яго месца не прадугледжана. Але не выключана, што з часам магчымасць выставіць твор з'явіцца. Зараз жа можна меркаваць, што для работы выдатнага майстра будуць у наступным створаны належныя ўмовы захоўвання.

Дыярама "Мінскі кацёл" работы беларускіх мастакоў, якая доўгі час з'яўлялася адным з эмацыйных акцэнтаў экспазіцыі, нядаўна была перададзена Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь.

Былі ў мяне і яшчэ пытанні да Ганны Галінскай, у прыватнасці, пра канцэпцыю экспазіцыі. Яна нагадала, што навуковую частку распрацоўвалі беларускія спецыялісты, а дызайн-праект рабілі ў Польшчы. Рэалізуецца ж праект рукамі нашых мастакоў.

Што сказаў архітэктар

Кожны можа пераканацца, што ў структуру будынка музея гарманічна ўпісаўся мемарыял ў гонар надання Мінску звання "горад-герой" — стэла і бронзавая Маці-Радзіма. Дарэчы, менавіта аўтар гэтай скульптуры Валянцін Занковіч і ягоны калега Аляксандр Дранец зрабілі рэльефы на "промнях"-пілонах новага гмаху. Па словах аўтара праекта будынка музея Віктара Крамарэнкі, на стадыі зацвярджэння праекта адбываліся бурныя спрэчкі адносна мэтазгоднасці такой аздобы пілонаў...

Ён сам зыходзіў з таго, што пластыка на "промнях" патрэбна для, так бы мовіць, падтрымкі скульптуры, для гарманізацыі прасторы, візуальна задзейнічанай галоўным фасадам і мемарыялам перад ім. Архітэктар сваю пазіцыю здолеў адстаяць...

Старая карціна не "ўпісваецца" ў новую раму?

Пра далейшы лёс мастацкіх твораў з фондаў Музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і іншых работ мастацтва савецкай эпохі — **чытайце на старонках 4 — 5.**

Афіцыйна

Увага да захавання аб'ектаў культурнай спадчыны садзейнічае ўмацаванню дзяржаўнасці. Такі пункт гледжання выказаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка сёння на сустрэчы з генеральным дырэктарам UNESCO Ірынай Бокавай. Пра гэта паведамляе Прэс-служба беларускага Лідара.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на важнасць захавання аб'ектаў культурнай спадчыны. "Для нас вельмі важна знайсці ў нашым мінулым тое, што звязвае нас з сучасным. Мы не хацелі б забываць, адкуль мы родам, таму вялікую ўвагу ўдзяляем гэтым аб'ектам. Тым больш, што яны садзейнічаюць умацаванню нашай дзяржаўнасці і лішні раз даказваюць, што Беларусь — старажытная зямля, розныя дзяржавы тут былі, па-рознаму складаўся лёс. Але сёння ёсць Беларусь — самастойная незалежная дзяржава, якая каранямі ідзе ў мінулае", — сказаў ён.

Прэзідэнт адзначыў, што тое, чым займаецца UNESCO, вельмі сімвалічна і важна. Ён звярнуў увагу, што адна са статутных мэт арганізацыі — супрацоўніцтва дзяржавы ў мэтах бяспекі праз навуку, адукацыю і культуру. "Нам прыемна, што UNESCO займаецца менавіта такой праблематыкай", — падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы.

Што да культуры, то, паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, Ірына Бокава сама зможа ўбачыць знакавыя аб'екты ў Беларусі, у тым ліку ўнесеныя ў Спіс Сусветнай спадчыны UNESCO.

Прэзідэнт падзякаваў генеральнаму дырэктару UNESCO за візіт, адзначыўшы, што кіраўнікі арганізацыі наведвалі Беларусь. "Было б несправядліва, калі б вы не прыехалі да нас, будучы генеральным дырэктарам, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. — Вы заўсёды можаце на нас разлічваць у арганізацыі: мы заўсёды будзем падтрымліваць вашы ініцыятывы. Тым больш, што яны вельмі патрэбныя і выгадныя не толькі нам, але і ўсяму чалавецтву".

З выстаўкай "Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі" Ірыну Бокаву знаёміць яе куратар Уладзімір Шчасны. / Фота Юрыя ІВАНОВА

Тэндэнцыі

Згадка пра клубную будучыню

"Наперад" для клубных устаноў — нястомная мадэрнізацыя матэрыяльна-тэхнічнай базы аграгарадкоў. Зрэшты, іх перспектыва наўпрост залежыць ад заможнасці тутэйшай сельскагаспадарчай арганізацыі. Застанецца яна на плаву — выжыве і мясцовы СДК. Я абсалютна не пра тое, на чыім балансе знаходзіцца клуб. Я — пра шляхетнае стаўленне да звання "гаспадар". Вось Арлоўскі ў родных Мышкавічах быў за савецкім часам сапраўдным гаспадаром. Ды і пасля яго ў калгас "Рассвет" запрашалі лепшых спецыялістаў: не толькі сельскагаспадарчага профілю, але і культурна-эстэтычнага. Азеляненнем цэнтральнай сядзібы займаліся лепшыя ў рэспубліцы ландшафтныя дызайнеры, у школе мастацтваў выкладалі лепшыя музыканты і мастакі, якія на заробкі не скардзіліся. А маладыя спецыялісты павінны былі конкурсны адбор вытрымаць, каб трапіць у Мышкавічы. Карацей, ніхто ў Мінск з'язджаць тады не збіраўся.

Традыцыі падтрымліваюцца ў Мышкавічах і па сёння. Праўда, далёка не за тыя заробкі і з іншым канчатковым вынікам. Прынамсі, Палац культуры і дасюль нагадвае знешнім выглядам палац. Не, і на сёння ў Беларусі існуюць пэўныя стасункі паміж СДК і СВК. Але, у лепшым выпадку, стасункаванне зводзіцца да прадастаўлення транспарту для клубнікаў і выдаткавання сціплых грошай для набыцця ці падарункаў, ці сцэнічных касцюмаў для калектываў. Так званае кропачна-эпізадычнае ды, бывае, што прыхоўваць, змушанае спонсарства без намёкаў на трывалае безахвярнае мецэнацтва. Пра горшыя выпадкі лепш і не згадваць…

Меркаванне эксперта

Начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ельскага райвыканкама Валерый Гейхман пераканаены, што клубныя ўстановы рана ці позна прыйдуць да неабходнасці ўласнай самаакупнасці. І гэта будуць буйныя комплексныя аграгарадоцкія цэнтры з пастаянна ўдасканальваемай тэхбазай, магутным кадравым патэнцыялам і тэндэнцыяй да развіцця аграэкатурызму…

Куды ісці? Натуральна, наперад. Ды толькі вось дзе яно, тое "наперад"? Бліжэйшая перспектыва, падавалася б, акрэслена Дзяржпраграмай "Культура Беларусі". Але пры "наяўнасці адсутнасці" належнага фінансавання канкрэтных адказаў на пытанне "А што будзе заўтра?" не дае і яна. Не, што рабіць работнікі культуры ведаюць добра: адраджаць, захоўваць, прапагандаваць ды прымнажаць… Балазе мэты і задачы ў нас застаюцца непахіснымі. Змяняюцца хіба сродкі іх дасягнення ды вырашэння. Тэндэнцыі — гэта, папросту кажучы, кірункі развіцця і звязаныя з гэтым заканамернасці. Не бяруся браць на сябе абавязкі эксперта па адсочванні названых заканамернасцей. Адзіная мая перавага — журналісцкая: шмат бачыў і магу параўноўваць. Кожнае маё суб'ектыўнае меркаванне можа і павінен аспрэчыць любы ахвотны і неабыякавы чытач. І гэта абавязкова стане падставай для чарговай публікацыі. Але не будзем забягаць наперад. Рушыць тут варта паступова і з развагай…

Яўген РАГІН

А дзе тое "наперад"?

Як і куды развівацца рэгіянальнай культуры

Гісторыя развіваецца па спіралі. Катэджы для даярак і механізатараў будаваліся яшчэ пад час брэжнеўскага кіраўніцтва. І гэта, як бачна, вёску не надта выратавала. Будаваць, напэўна, варта свядомасць. Чым? І годнымі заробкамі, якія дапамагаюць развіццю такога пачуцця, як самапавага. Гэтае пачуццё і дапамагае дакладна вызначыць, дзе тое "наперад".

Тэатральна-бібліятэчная перспектыва

Не хочацца, а трэба сказаць… За без малога дзесяць гадоў працы ў рэдакцыі "Культуры" быў узрушаны ад наведвання сельскіх бібліятэк толькі пару-тройку разоў. Адзін з іх звязаны з выпадковай паездкай у аграгарадок "Мішневічы" Шумілінскага раёна. Тым познім зімовым вечарам здзівіў не столькі шыкоўны зімовы сад, што "атабарыўся" ці не ва ўсіх бібліятэчных пакоях, колькі напоўненасць тых пакояў чытачамі. Налічыў ці не два дзясяткі маладзёнаў — збольшага ўдзельнікаў бібліятэчнага тэатральнага гуртка, якім кіравала загадчыца ўстановы...

І яшчэ адзін прыклад бібліятэчнага прафесіяналізму, пра які без стомы распавядаю сельскім бібліятэкарам у час камандзіровак. Загадчык сельскай бібліятэкі ў Мішневічах Людміла Тарасава спачатку разабралася з чытачамі, а потым ужо пагаварыла са мной. І нават пад час гутаркі, калі ў дзвярах з'яўляліся людзі, яна, папрасіўшы прабачэння, бегла да іх: "А раптам гэта новыя чытачы!". Людміла Тарасава — лепшая ў Шумілінскім раёне. Сустракаўся з ёй у 2008-м. Стала цікава, ці працуе яна цяпер. Праўда, як кажуць, мясцовая сельскагаспадарчая арганізацыя стала, мякка кажучы, не такой заможнай. (Тэндэнцыя? Тэндэнцыя! І сярод аграгарадкоў сёння адбываецца жорсткі натуральны адбор…)

Моладзь з Мішневічаў пакрысе знікае. Тэатральны гурток, што складаўся ў асноўным са старшакласнікаў, спыніў існаванне. Тарасава раскруціла гурток краязнаўчы, куды ўвашлі дарослыя ды дзятва. Няхай ёй шчасціць у гэтай справе…

Тады, у 2008-м, падумаў пра тое, што тэатральны акцэнт — самы арганічны для бібліятэчнай установы, а працяг папулярызацыі кнігі і барацьбы за чытача — на клубнай сцэне. Даўно гэта зразумелі ў дзіцячых бібліятэках Асіповіччыны, дзе дзіцячыя лялечныя тэатры сталі нормай. І нездарма Магілёўскі дзяржаўны бібліятэчны каледж пачаў выпускаць апошнім часам "кніжнікаў" з навыкамі правядзення клубных масавых мерапрыемстваў. Тэатр-бібліятэка — чым не новы тып якасна новай па комплексных задачах і шырокіх перспектывах установы культуры?!

Зараз ідзе інтэграцыя школьных ды публічных бібліятэк. Мы пакрысе зжыліся з думкай, што і тут разумная аптымізацыя — справа карысная. Калі ў сельскую бібліятэку не надта ходзяць, дык у школьнай заўжды захаваецца гарантаванае чытацкае кола. (Захаваецца, натуральна, пры ўмове захавання школ, якія сёння аптымізуе само жыццё. І гэта таксама не надта радасная тэндэнцыя.)

А вось у пэўных сельскіх бібліятэкараў схільнасці іншыя. "Ну як можна бібліятэку закрываць! — даводзіла ў запале спрэчкі адна з работніц культуры. — За мяне — уся вёска. Калі б у краме павесілі скрыню для галасавання, усе прагаласавалі б за мяне". Меркаванне ідэаліста: а чаму ідэю не ўвесці ў практыку дадатковай ацэнкі бібліятэчнай запатрабаванасці? Фармальным справаздачам паверыць цяжка, а вось такому персаніфікаванаму (што важна!) vox populi — заўжды і з радасцю. І ўвогуле, па маім суб'ектыўным меркаванні, аптымізаваць варта не толькі бібліятэчную сетку, але і справаздачы (ад сяла да раёна), што развіваюць недарэчныя бюракратычныя схільнасці ды замінаюць удасканаленню прафесійнай творчасці…

Неаспрэчным застаецца адно: бібліятэчную справу і надалей неабходна аніміраваць (ключавое слова — "анімацыя"), ажыўляць, расфармалізоўваць. Не хачу згадваць будучы электронны складнік сельскай бібліятэкі, бо справа гэтая — непазбежная.

Меркаванне эксперта

Дырэктар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі Валянціна Дуброва прытрымліваецца думкі, што вельмі пашанцавала тым вёскам, дзе з часін савецкіх калгасаў-мільянераў захаваліся гмахі культуры. У перспектыве, па яе перакананні, тут размесцяцца не толькі клубы ды бібліятэкі, а і цэлы комплекс сацыяльна-культурных паслуг: кавярні, крамы, стаматалагічныя кабінеты, трэнажорныя залы ды гульнявыя пакоі, сацыяльныя службы. Такія "кангламераты" дапамогуць выжыць бібліятэчнай справе. Чалавек, завітаўшы сюды ці не на палову дня, не абміне і кніжныя паліцы. Пры ўмове, канешне ж, калі не будуць яны патыхаць сумам ды творчай бяздзейнасцю…

Гаворка пра "наперад" — доўгатэрміновая. Па-за полем зроку пакуль засталіся раённыя і сельскія музеі, дамы рамёстваў, ДШМ… Будзем ўдзячны, калі да выяўлення тэндэнцый ды перспектыў падключыцеся і вы, чытачы "К"!..

К

Рэплікі пра…

…духоўны заняпад і "асяроддзе пражывання"

Ларыса КНЯЗЕВА, бібліятэкар другой катэгорыі Рабовіцкай сельскай бібліятэкі-клуба, Слаўгарадскі раён:

— Узровень культуры ў грамадстве падае. Дастаткова паглядзець тэлевізар, пачытаць папулярныя часопісы, паглядзець "шэдэўры" сучаснага мастацтва, каб прыйсці да сумнай высновы: дэмакратызацыя грамадства, што мае на ўвазе і дэмакратызацыю культуры, вядзе, відаць, і да духоўнага жабрацтва. Не, у нас ёсць добрыя пісьменнікі, рэжысёры, мастакі… Але іх мала, і яны ў адзін голас кажуць: культура гібее, у яе носьбітаў няма "асяроддзя пражывання", а грамадства нібыта забылася на вечныя каштоўнасці з-за клопату пра здабычу грошай. І так жыве пераважная большасць людзей. Яны губляюцца ў атмасферы цынізму, бездухоўнасці ды няўпэўненасці ў заўтрашнім дні. А хтосьці, наадварот, пачувае сябе досыць камфортна, знаходзіць сапраўднае задавальненне ад таго, што можна палавіць рыбку ў каламутнай вадзе. Масавае забаўляльнае мастацтва навязваюць нам стэрэатыпы паводзін, якія супярэчаць нашаму нацыянальнаму характару. А тон нешматлікіх сапраўдных твораў — трагічны. На каго спадзявацца? На моладзь? Хочацца верыць, што ў гэтым асяродку ёсць шчырыя і неабыякавыя людзі, заклапочаныя лёсам Беларусі. Хочацца верыць, што засталіся яшчэ юнакі ды дзяўчаты, якія не губляюць аблічча, на першае месца вылучаюць творчую асобу, нашу гісторыю і культуру…

…недарэчны пераклад

Віктар КОРБУТ, спецыяльны карэспандэнт газеты "Советская Белоруссия", аўтар кнігі "Минск. Лучший вид на этот город":

— Паказваюць фільм пра так званы пояс Вітаўта. Стужка створана "Белвідэацэнтрам" па заказе Міністэрства культуры Беларусі на рускай мове. Добра, у нас жа сапраўды дзве дзяржаўныя мовы. На экране з'яўляецца знакаміты Адам Мальдзіс. Каментуе прафесар гісторыю пояса па-беларуску. Я адышоў ад экрана з нейкай пільнай справай — і раптам чую ўжо не голас Мальдзіса, але паказваюць яшчэ яго. Пасля Мальдзіс ізноў загучаў. І тут да мяне дайшло: яго беларускамоўны каментарый пераклалі на рускую мову ды агучылі! І гэта яшчэ не ўсё. Па-беларуску гаварыла Ірына Колабава, мая ўніверсітэцкая выкладчыца, сястра нумізмата Валянціна Рабцэвіча. І яе "заглушылі" ды пераклалі… "Беларусь 3", Міністэрства культуры, "Белвідэацэнтр" — хто ж патлумачыць, які сэнс беларускую мову перакладаць на рускую на беларускім жа тэлеканале?

…мастацтва шырокага спажывання

Галіна ПІЛЕВІЧ, педагог-мастак, Мазыр:

— Так званая інфармацыйная рэвалюцыя прывяла да таго, што чалавек змушаны жыць у адмоўным эмацыйным полі.

Зваротная сувязь

Калектыўныя дагаворы: практыка выканання

Апошнім часам на адрас газеты "Культура" пачалі паступаць звароты ад нашых падпісчыкаў ды чытачоў з просьбай дапамагчы разабрацца і асвятліць на старонках выдання няпростую, на іх погляд, сітуацыю, звязаную з практычным выкананнем асобных умоў Тарыфных пагадненняў і калектыўных дагавораў. Звароты звязаны з тым, што асобныя кіраўнікі папросту ігнаруюць умовы Тарыфных пагадненняў і калектыўных дагавораў. Па адпаведныя тлумачэнні мы звярнуліся ў Федэрацыю прафсаюзаў Беларусі і атрымалі адказ за подпісам намесніка старшыні ФПБ А.С. Мікшы. Вось яго тэкст:

"У адпаведнасці з артыкулам 358 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (далей — ПК) пагадненне — нарматыўны акт, які змяшчае абавязкі бакоў па рэгуляванні адносін у сацыяльна-працоўнай сферы на ўзроўні пэўнай прафесіі, галіны, тэрыторыі.

Згодна з артыкулам 361 ПК калектыўны дагавор — лакальны нарматыўны прававы акт, што рэгулюе працоўныя і сацыяльна-эканамічныя адносіны паміж наймальнікам і яго работнікамі.

Калектыўны дагавор рэгулюе працоўныя і звязаныя з імі адносіны паміж работнікамі і наймальнікам на аснове норм, устаноўленых у нарматыўных прававых актах, у Генеральным, тарыфным і мясцовым пагадненнях, а таксама норм, устаноўленых па пагадненні бакоў непасрэдна ў калектыўным дагаворы.

Мэтай прыняцця калектыўнага дагавора з'яўляецца забеспячэнне сацыяльна-эканамічнай абароны работнікаў праз устанаўленне адпаведнага ўзроўню аплаты працы, поўнай і прадуктыўнай занятасці, здаровых і бяспечных умоў працы, эфектыўнай, прыбытковай працы арганізацыі.

Калектыўны дагавор дазваляе ўстанаўліваць дадатковыя, у параўнанні з дзеючым заканадаўствам, палажэнні аб умовах працы і яе аплаты, сацыяльным і жыллёва-бытавым забеспячэнні работнікаў арганізацыі, гарантыі і кампенсацыі, якія прадастаўляюцца наймальнікам.

Адным з асноўных прынцыпаў сацыяльнага партнёрства з'яўляецца абавязковасць выканання дамоўленасцей і адказнасць за прынятыя абавязкі (артыкул 353 ПК).

Згодна з пунктам 9 артыкула 55 ПК абавязкам наймальніка пры арганізацыі працы работнікаў з'яўляецца забеспячэнне выканання заканадаўства аб працы, умоў, устаноўленых калектыўнымі дагаворамі, пагадненнямі, іншымі лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі і працоўнымі дагаворамі.

Змяненні і дапаўненні ў калектыўны дагавор, пагадненне ўносяцца па ўзаемнай згодзе бакоў у парадку, устаноўленым ПК для іх заключэння (артыкул 372 ПК). Выходзячы з дадзенай нормы, унясенне змяненняў (у тым ліку прыпыненне дзеяння асобных норм) у калектыўны дагавор, пагадненне ў аднабаковым парадку будзе з'яўляцца парушэннем дадзенага артыкула.

На падставе артыкула 375 ПК кантроль за выкананнем калектыўнага дагавора, пагаднення ажыццяўляецца бакамі, а таксама спецыяльна ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі нагляду і кантролю за выкананнем заканадаўства аб працы.

Адказнасць бакоў за невыкананне норм калектыўнага дагавора замацавана ў артыкуле 376 ПК, згодна з якім за невыкананне норм і абавязкаў, прадугледжаных калектыўным дагаворам, бакі нясуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам, калектыўным дагаворам.

Разам з тым, артыкулам 9.19 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністратыўных правапарушэннях прадугледжана адміністратыўная адказнасць за парушэнне заканадаўства аб працы (далей — КоАП).

У прыватнасці, часткай чацвёртай дадзенага артыкула 9.19 прадугледжана адказнасць за іншыя (наўпрост не прадугледжаныя КоАП) парушэнні заканадаўства аб працы. Правам прыцягнення да адказнасці надзелены Дэпартамент дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

Прыведзеныя вышэй нормы заснаваны, у прыватнасці, на міжнародным заканадаўстве, Рэкамендацыі МАП № 91 "Аб калектыўных перамовах", згодна з пунктам 3 якой усякі калектыўны дагавор павінен звязваць бакі, што яго падпісалі, а таксама асоб, ад імя якіх ён заключаны.

Неабходна таксама адзначыць, што ў адсутнасці кіраўніка яго паўнамоцтвы па кіраванні арганізацыяй ускладаюцца на адпаведную службовую асобу, якая надзяляецца ўсім аб'ёмам правоў і абавязкаў кіраўніка арганізацыі".

Фотасюжэт нумара

Пераезд напоўніцу!

У фотасюжэце Юрыя ІВАНОВА — штрыхі да пераезду ў новы будынак Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Пра тое, што чакае мастацкія творы з фондаў пасля пераезду, **чытайце на старонках 1, 4 — 5.**

Увага! Удакладненне!

У сувязі з тым, што ў мінулым нумары дадзеная аб'ява прайшла з тэхнічнай памылкай, перадрукоўваем дакладны тэкст.*

Дворец Республики

объявляет конкурс на замещение вакантных должностей в Президентский оркестр Республики Беларусь

артист эстрадно-симфонического оркестра:

виолончель — 1 чел. *(на 0,5 ставки на время отпуска по уходу за ребенком)*;

валторна — 1 человек;

труба — 1 человек;

саксофон — 1 человек;

контрабас — 1 человек.

Срок подачи заявок и документов — до 12.05.2014, по адресу: 220030, г. Минск, Октябрьская пл., 1-1.

К заявлению прилагать документы, предусмотренные Инструкцией о порядке проведения конкурса, утвержденной Министерством культуры Республики Беларусь от 22.01.2009 № 3.

Для резюме: факс: 229-91-84; e-mail: dirork@yandex.ru.

Дополнительная информация по телефонам: 229-90-50, 229-90-08, 229-90-04.

Такі дэструктыўны ціск абмяжоўвае нашы пачуцці страхам, крыўдай, бяссіллем, расчараваннем, зайздрасцю… Культура згубіла карані і ператварылася ў цывілізацыю, дзе губляюцца сэнс і вышэйшыя мэты існавання чалавечай гісторыі. Памятаеце, як трапна пра гэта заўважыў Антон Чэхаў: "Культура без сэрца (маралі) ёсць не культура, а "дурнотная цывілізацыя", што стварае гібельную тэхніку і прыніжанае, пакутлівае жыццё, уплыў якога мы на сабе ўжо даўно адчуваем".

Шырспажыву супрацьстаялі сапраўдныя творцы, такія, да прыкладу, як Уладзімір Мулявін, Уладзімір Высоцкі… У іхніх песнях вечна жыве народная душа. Славянская культура павінна зацвярджаць прыярытэт веры ў духоўныя традыцыі над халоднай меркантыльна-камерцыйнай свядомасцю і прыярытэт "інтымнасці" ў адносінах чалавека з Богам…

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!

Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.

Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by

Тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97

Абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby
vk.com/kimpressby
twitter.com/kimpressby

Па пытаннях размяшчэння рэкламы ў газеце "Культура"
звяртайцеся па тэлефоне +375 17 286 07 97
і па тэлефоне/факсе +375 17 334 57 41 альбо на электронны адрас kultura@tut.by!

Дзяжурны па нумары

Прыдбаць каня і маслабойку…

Яўген РАГІН,
рэдактар аддзела газеты "Культура"

Сёння — пра самадастатковасць. Вельмі люблю гэтае слова. Яно — стрый слову "незалежнасць". Як там Янка Купала казаў? "...Незалежнасць можа даць і праўдзівую свабоду, і багатае існаванне, і добрую славу нашаму народу". Самадастатковасць як прага самаадукацыі ды навучання на чужых памылках — найвышэйшая праява прафесіяналізму і адноснай незалежнасці ад знешніх абставін.

Як беларускі "дарэвалюцыйны" вясковец, што жыў недзе паміж Асвеяй і Лельчыцамі, станавіўся самадастатковым (чытай: адносна незалежным ад крызісаў і сацыяльныхператрусаў)? Працаваў усім родам на зямлі, гадаваў пчол ды авечак, прадаваў жыта, мёд ды каноплі — свету белага не бачыў. Затое праз час меў магчымасць прыдбаць каня і маслабойку, карміў сябе і сваякоў, задумваўся пра тое, як займець вятрак. Спадзяваўся толькі на надзел зямлі ды ўласныя рукі. Менавіта адсюль — прадпрымальнасць, ініцыятыва, гарантаваная ўласная капейчына і перспектыва развіцця. Карацей, усё тое, што і характарызавала разумнага гаспадарніка, якога ўсе прызвычаіліся называць кулаком. Каму ён замінаў?.. Рэвалюцыі, рэпрэсіі-раскулачванні, войны, застой, перабудова, крызісы… Кулацтва знікла як клас...

На гэтым — усё пра сельгасвытворчасць. Уся вышэйпрыведзеная падводка толькі для таго, каб павесці гаворку пра самадастатковасць сельскага работніка культуры. Здаецца, і ён таксама знікае як "клас". Аптымізму дадае толькі тое, што аптымізацыя — працэс, адваротны раскулачванню. Апрача "бедных" (незапатрабаваных) устаноў знікнуць і тыя, якія не здолелі стаць запатрабаванымі, маючы для гэтага літаральна ўсе падставы. Жадання не стае, выдумкі, урэшце — прафесіяналізму. Якая тут ініцыятыва, калі дні лічыш да пенсіі? А тут яшчэ аптымізацыя з інтэграцыяй і мадэрнізацыяй. У кожным рэгіёне вядуць яе цяпер па-свойму. Агульных рэкамендацый гэтаму працэсу не дае ніхто. Таму і нагадвае ён спуск па горнай рацэ на лядашчым чоўне паміж вераломных заканадаўча-фінансавых падводных камянёў.

Што рабіць? На маю думку, пераўтвараць човен у дыхтоўны. Для ўмацавання самадастатковасці і хоць нейкай незалежнасці ад прапанаваных часам абставін. Хтосьці з апанентаў будзе смяяцца: "Ты, Рагін, прапануй яшчэ прыдбаць клубам ды бібліятэкам каня з маслабойкай!" А смяяцца няма чаго. У Культурна-забаўляльным цэнтры "Бубнаўка" Акцябрскага раёна і коні ўжо ёсць, і човен, і амфітэатр, і музей пад адкрытым небам, і хлеб з маслам для гасцей. Хтосьці толькі марыць пра кластары культуры, а ў Акцябрскім раёне ён існуе аж з 2008-га. Праўда, тады "Бубнаўка" зарабіла на сямейным адпачынку з элементамі адукацыйнага, культурнага і спартыўнага выхавання ўсяго 5 мільёнаў рублёў. А за мінулы год ужо — без малога 200 мільёнаў. І я тут — не пра камерцыю, а пра вялікую запатрабаванасць установы, выражаную ў гэткім жа па велічыні грашовым эквіваленце.

І, што вельмі цешыць ды абнадзейвае, не адзін такі аддзел на Беларусі. Маючы 200 пазабюджэтных мільёнаў у кішэні, можна падумаць і пра рост заробкаў у асобна ўзятым самадастатковым аддзеле. Інакш кажучы, каб выжыць і застацца, трэба навучыцца быць заўважным у маштабах рэспублікі. І такі абгрунтаваны самапіяр становіцца для асобных аддзелаў нормай. Яшчэ некалькі гадоў таму публікацыі нашых пазаштатнікаў на старонках "К" можна было аб'яднаць жанрам сухой і нецікавай справаздачы. Сёння ж ліставанні з раёнаў схіляюцца ў бок праблемнасці ды аналітыкі. І лідзіруюць тут Віцебшчына ды Гомельшчына. Што будзе заўтра?

Так, кадравы патэнцыял нашых вёсак састарваецца на вачах. Так, вёскі неўтаймоўна выміраюць. І я перакананы, што спыніць дэмаграфічную катастрофу павінны і здольны менавіта сельскія работнікі культуры. Пад час нашага з Кастусём Антановічам аўтапрабегу па Беларусі бачылі мы адносна буйныя паселішчы, дзе і крамы няма, і клуба. Па чым сумуюць вяскоўцы? Не па магазіне, які худа-бедна замяніла аўтакрама, а па клубе з бібліятэкай. Яны — "вёсказахавальныя". Як прыцягнуць у такія паселішчы маладых спецыялістаў? Як сцвярджаюць спецыялісты: разумна (аптымізавана) весці гаспадаранне і развіваць "зарплатаўтваральную" пазабюджэтную дзейнасць, бо іншых фінансавых уліванняў па гэтым артыкуле пакуль не прадбачыцца…

Гадавы цыкл нашага аўтапрабегу па вёсках Беларусі завершаны. Наступны мы мяркуем прысвяціць не фіксацыі брэндаў, а як мага больш грунтоўнаму адлюстраванню працэсу аптымізацыі. І шукаць будзем найперш самадастатковых, бо вельмі ж хочацца, каб развіваліся не толькі аграгарадкі, абласныя цэнтры ды Мінск, але і вёскі.

К

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77, альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby

Пано Савіцкага

Старая карціна не "ўпісваецца" ў новую раму?

Тое самае пано работы Міхаіла Савіцкага. / Фота да матэрыялу — Юрыя ІВАНОВА

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Мы запыталіся ў Віктара Уладзіміравіча: ці "азіраўся" ён у часе працы над праектам, скажам, на маскоўскую Паклонную гару? Ці падобны наш музей на аналагічны тамтэйшы, а калі не, дык чым адрозніваецца? Архітэктар запэўніў нас, што будынак нашага музея — абсалютна арыгінальная распрацоўка. Раскрыць шматзначную тэму вайны сродкамі архітэктуры даволі складана. Трэба было знайсці вобраз, які адпавядаў бы пастаўленай мэце і не меў аналагаў у сусветнай практыцы. Вынікам творчых пошукаў стала, напрыклад, канцэптуальнае рашэнне залы Перамогі. Яна перакрыта шклом: гэта дазваляе бачыць неба. Мірнае неба. Такім чынам яно становіцца эмацыйным фонам экспазіцыйнага шэрагу. У зале ўсталяваны Алтар Перамогі вышынёй 12 метраў. Такога таксама дагэтуль нідзе не было. А яшчэ вышэй згаданыя "промні"-пілоны, што сімвалізуюць святочны салют; "падаючыя" сцены, якія вобразна ўвасабляюць разбурэнні, выкліканыя вайной, і адначасова — адпор агрэсіі...

Дык месца ўсё ж няма?

Паколькі архітэктар зыходна меў на мэце стварэнне новага вобраза экспазіцыі, імкнуўся арганізаваць прастору паводле нязвыклых для шырокай грамады прынцыпаў, уключэнне ў гэты кантэкст твораў мастацтва, больш-менш адпаведных традыцыйнай эстэтыцы, станавіўся праблемным. Той жа роспіс "Вялікая Айчынная вайна" пэндзля Савіцкага мог бы глядзецца ў новых сценах зусім не так гарманічна, як на старым месцы.

Відаць, адыграла ў сітуацыі пэўную ролю і тая акалічнасць, што дызайн-праект экспазіцыі рабілі замежнікі. Адпаведна, ім цяжка зразумець, што такое для нас творчасць Савіцкага. Зыходзячы са свайго досведу і менталітэту, яны маглі папросту не браць да ўвагі мастацкія творы, якія аздаблялі стары музей. Можа, экспазіцыя і без пано Савіцкага атрымаецца выразнай. І ўсё ж мне шкада, што адна з найлепшых у беларускім выяўленчым мастацтве работ на ваенную тэматыку знікае на няпэўны час з вачэй публікі. Скажу больш: дадзены твор — не проста жывапіс, а дакумент часу, які сёння мае гістарычную каштоўнасць не меншую, чым ваенныя артэфакты 1941 — 1945 гадоў. Сама біяграфія вялікага майстра, абаронцы Айчыны і вязня фашысцкіх канцлагераў, — гэта летапіс нацыянальнай гісторыі. А ягоны погляд на вайну быў ісцінай ці не ў апошняй інстанцыі для некалькіх пакаленняў беларусаў. Такая асоба мае права быць згаданай, а яшчэ лепш — грунтоўна прадстаўленай у Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны...

Жывапіснае пано работы Міхаіла Савіцкага будзе дэмантавана і таксама перавезена ў новы будынак. Але пакуль — толькі ў сховішча. Там ім зоймуцца рэстаўратары. У экспазіцыі, якая адкрыецца 3 ліпеня, для яго месца не прадугледжана. Але не выключана, што з часам магчымасць выставіць твор з'явіцца.

К

Вяртаючыся да надрукаванага

Які лёс чакае "Берагіню"?

Публікацыя ў "К" артыкула этнахарэографа і заснавальніка фестывалю "Берагіня" Міколы Козенкі выклікала рэзананс сярод чытачоў, якія занепакоены далейшым лёсам гэтага этнапраекта. Сёння мы публікуем чарговы водгук.

"Ёсць успаміны, што з цягам часу становяцца ўсё больш яскравымі і значнымі. У мяне так з фестывалем "Берагіня", на які я быў запрошаны ў чэрвені 2012 года ў Акцябрскі, вядомы і як Рудабелка — цэнтр партызанскага руху на Палессі ў час Вялікай Айчыннай вайны. І тое, што нашчадкі тых мужных партызан падрыхтуюць добры фальклорны фэст, сумневаў у мяне не выклікала, але такога, калі шчыра, я не чакаў.

Уражанні ад Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва "Берагіня-2012" — незабыўныя: сотні прыгожых аблічча́ў аматараў фальклору, песні… Музыка, беларускі строі, узнёслы настрой — паэзія і жыццё побач... Тры дні — няспынныя конкурсы калектываў, адзін за другі лепшых. Прычым гэта ўсё — не "папса" ў выглядзе надакучлівай самадзейнасці, а карэнныя народныя танцы, песні, фрагменты абрадаў з розных рэгіёнаў Беларусі. Агульнае ўражанне ад фэсту ў мяне (чалавека, які мінуў мяжу свайго 80-годдзя і шмат чаго ў жыцці пабачыў) — каласальнае. Калі славяне змогуць адрадзіць уласную традыцыйную духоўнасць — гэта мусяць зрабіць менавіта людзі, што прайшлі "Берагіню" і падобныя "варункі" ды "горны" загартоўкі душы.

Лічу, што гэты фэст — адзін з найкарысных напрамкаў культурнай дзейнасці беларускай дзяржавы, што бездакорна праецыруецца на патрыятызм і ста-

КУЛЬТУРА / Соцыум 5
Няўжо аўтарствам даводзіцца падзяліцца?
АЛЕГ ЧЭЧАНЕЎ, акцёр, рэжысёр
Майстэрства (анты)плагіяту
На маю думку
Ці быць "Берагіні"? І якой...
Мікола КОЗЕНКА
Топ-10

На здымку злева — фрагмент першай дырамы.



Мастацкія творы з фондаў музея і экспанаты перад пераездам.

пойдзе ў сховішча

У працяг тэмы

Засмучае заганная, як мне падаецца, тэндэнцыя, калі пры рэканструкцыі, прыстасаванні пад новую функцыю аб'ектаў, знакавых для гісторыі ды культуры, ігнаруецца прынцып гістарычнай і, адпаведна, эстэтычнай пераемнасці. Бо калі нейкі адрэзак часу варты наймення "эпоха", дык і эстэтыку ён мае адметную. Яшчэ на самым золку 1990-х перад будынкам ЦК КПБ дэмантавалі бюсты Маркса і Леніна. Цяпер яны, на шчасце, знаходзяцца ў Мемарыяльным музеі-майстэрні Заіра Азгура. Я па часах СССР не сумую, але мяркую, што прывязка бронзавых карыфеяў да прасторы была ўдалай, ды і майстэрства Азгура пад сумнеў не ставіцца.

Ці насамрэч была патрэба выводзіць з прасторы фае Вялікага тэатра габелены Аляксандра Кішчанкі, каб на іх месца павесіць люстэркі? Лёс габеленаў Кішчанкі — увогуле асобая тэма. І тэма, на жаль, балючая... А каму муляў вока рэльеф у фае кінатэатра "Партызан", які зараз стаў Домам кіно? Ніхто не здолеў нам адказаць, што з ім сталася. Паводле адной з версій, рэльеф зашылі гіпсакартонам, паводле іншай — дэмантавалі, і дзе ён зараз, невядома. Што сталася з керамічнымі пано інтэр'ераў гасцініцы "Кастрычніцкая", якая перабудавана ў "Прэзідэнт-гатэль"? Дакладна вядома толькі тое, што яны больш не аздабляюць яе сцены. Інвестары будаўніцтва гасцініцы на беразе Свіслачы побач з цыркам, калі зацвярджаўся праект, абяцалі паклапаціцца пра помнік прамысловай архітэктуры — першай мінскай электрастанцыі, на месцы якой гасцініца будуецца. Разглядаліся варыянты: і захаванне фрагментаў фасада, і аднаўлення будынка за дваццаць метраў ад месца, дзе ён першапачаткова знаходзіўся... І калі гмах гасцініцы ўжо стаіць, то няма ніякіх знакаў аднаўлення страчанага помніка гісторыі. А колькі раз паўставала пытанне дэмантажу металічнага рэльефу работы Анатоля Арцімовіча на будынку Дома мод! Не пасуе, маўляў, змест новай рэчаіснасці — лепш на месцы рэльефу ўстанавіць экран для дэманстрацыі рэкламы…

Калісьці ў галіне рэстаўрацыі дамінавала практыка: навукоўцы вызначалі ў гісторыі помніка нейкі адзін, найбольш важны для яго, перыяд, і на аднаўленне эстэтыкі гэтага перыяду арыентавалі праекціроўшчыкаў ды выканаўцаў. Потым такі радыкальны падыход змянілі на больш узважаны: захоўваць знакі ўсіх эпох, якія адбіліся ў абліччы помніка. Трэба, нарэшце, навучыцца ставіцца да манументальнай спадчыны савецкай эпохі як да каштоўнасці. У шэрагу былых сацкраін, колішніх савецкіх рэспубліках, які раз пра тое кажам, манументальныя творы сацрэалізму збіраюць на музейных пляцоўках, што маюць немалы поспех у мясцовых жыхароў і турыстаў. Кантэкст, у якім змешчаны гэты сацрэалізм, — іншае пытанне (абяром свой!), але ж тое — якая ні ёсць гарантыя захаванасці.

більнасць самастойнай Беларусі, якая вельмі адказна ставіцца да захавання ўласнай вясковай, аграрнай інфраструктуры. Сёння гэта — аб'ектыўна-гістарычны факт. Безумоўна, "Берагіня" магла з'явіцца толькі на Беларусі. Мае калегі па фестывальным журы — напрыклад, дацэнт Санкт-Пецярбургскай дзяржаўнай акадэміі музыкі, мастацтвазнаўца Ірына Папова, прафесар Ровенскага гуманітарнага ўніверсітэта Мікалай Гадоўскі — гэтую маю думку, неаднаразова выказаную ў кулуарах фэсту, падзялялі. Таму мы мусім сваю "Берагіню" абараняць і захоўваць далей.

У дадзеным кантэксце лагічна вызначыць ролю і фальклору наогул, і фестывалю "Берагіня" ў прыватнасці ў культурна-ідэалагічнай падтрымцы аграрнай культуры Беларусі, ахове здаровай духоўнай асновы жыцця моладзі ў рэгіёнах. Пры граматнай культурнай палітыцы фальклорны рух (які ва ўмовах "Берагіні" інтэграваны ў шматпрыступкавую фестывальна-праектную дзейнасць) наогул здольны спрыяць далейшай стабілізацыі і развіццю вясковай, аграрнай сферы Беларусі. А, як вядома, духоўная народная культура — стрыжань духоўнай культуры нацыянальнай. Таму і меркаванні наконт нівелявання статуса "Берагіні" ў 2014 годзе з рэспубліканскага да рэгіянальнага, замест таго, каб працаваць над яе пераходам у статус дзяржаўнай праграмы (пра апошняе ёсць, дарэчы, рашэнне калегіі Міністэрства культуры за 2012 год), — нонсэнс.

Так, фестываль "Берагіня" сёння — адзіны ў краіне сістэмны адладжаны этнакультурна-выхаваўчы праект нацыянальнага маштабу, які мае 15-гадовы паспяховы досвед. Раз на два гады лепшыя дзіцячыя і юнацкія фальклорныя калектывы кожнага раёна, што працуюць з мясцовай этнаграфічнай спадчынай (як працаваць — добра прапісана навукоўцамі ў Палажэнні пра фестываль), сустракаюцца на абласных адборачных турах. Тут кожная вобласць выбірае лепшы гурт для заключнага фэсту ў Акцябрскім. Ну а кампетэнтнае журы (навуковыя эксперты-фалькларысты са сталічных ВНУ культуры і мастацтваў і Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) на фінальных імпрэзах — заўсёды разгледзіць і адданасць мясцовым караням, і мастацкі талент, і камандны дух самабытных фальклорных гуртоў. Як я ўжо казаў, найбольш здзіўляў мяне, сівога прафесара, менавіта пяшчотны ўзрост аматараў фальклору на сцэне "Берагіні", бо гэта — нашы дзеці. І колькі б чыноўнікі ні казалі пра эканомію грошай ды часовыя праблемы галіны культуры — гэта несур'ёзна, бо хто ж эканоміць на сваіх дзецях?

Таму, лічу, тыя сродкі, што пойдуць на правядзенне фестывалю сёлета, акупяцца "з запасам". А той духоўна-патрыятычны ўздым, які кожны раз выклікае гэты фестываль, тая радасць, задавальненне, гонар за сваю краіну — увогуле неацэнныя...

Энгельс ДАРАШЭВІЧ,
прафесар кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, доктар філасофскіх навук"

На маю думку...

Вучымся радавацца



Уладзімір ШАБЛІНСКІ,
дырэктар канцэртнага агенцтва, прадзюсар, уладальнік аграсядзібы

Я ладжу на сваім хутары самыя розныя канцэрты і фестывалі. Мяне часта пытаюць журналісты: маўляў, ці можна такія мерапрыемствы праводзіць у любым раённым цэнтры, у любой вёсцы Беларусі? Напэўна, маюць на ўвазе, што нефармальная акцыя, а такіх ладжу большасць, — заўжды якасная, а таму — цікавая... Я пастараюся адказаць на гэтае пытанне. Але спачатку давайце паразважаем вось над чым. Чаму ў нашай краіне анансуецца безліч самых разнастайных дзяржаўных і камерцыйных святаў, канцэртаў ды фестываляў, але яркіх і запамінальных падзей з іх ліку на выхаде — да крыўднага мала?

Еўрапейскія прыклады пераконваюць, што большасць рэгіянальных свят ініцыююцца не дзяржаўнымі ўстановамі, а жыхарамі мястэчак. І справа тут не ў грошах, не ў выверанай рэжысуры, нават не ў прафесіяналізме выканаўцаў, а ў элементарным жаданні і ўменні радавацца жыццю. А радасць, як вядома, не ўзнікае па загадах ды інструкцыях. Калі ж на першае месца вылучаецца "абавязалаўка", дык і свята аказваецца прыцягнутым за вушы. У клубнікаў ёсць план па правядзенні мерапрыемстваў, яго неабходна выконваць, а часу не стае. Таму збольшага фэсты гарадоў ды вёсак ажыццяўляюцца ці не па адным сцэнарыі — змяняюцца толькі ўдзельнікі і дэкарацыі. Планавая руціна паглынае жывую творчасць. Ці не ў гэтым уся справа?..

У маркетынгу ёсць паняцце "дэлегаванне паўнамоцтваў". Ці не час надзяліць раёны і вёскі гэтымі паўнамоцтвамі ў справе наладжвання нефармальных масавых мерапрыемстваў? Каб не стрымліваць ініцыятыву знізу ці накіроўваць яе ў рэчышча задавальнення нейкіх вельмі канкрэтных патрэб, як гэта было за савецкім часам, калі мы 1 Мая ці 7 лістапада насілі на дэманстрацыях партрэты членаў Палітбюро. А ці ж можна адбіраць у людзей натуральнае жаданне радавацца? Лепшыя ўзоры мастацтва створаны дзякуючы менавіта гэтаму пачуццю. І вясковыя абрадавыя фэсты калісьці былі святамі ледзь не сямейнымі, бо ў вёсцы ўсе — родзічы ды сваякі. Як узнавіць такую камернасць, як навучыцца радавацца простым рэчам — сустрэчы з сябрамі, суладнай песні, — а не ператвараць шчырае свята ў ненатуральнае для сельскіх ваколіц псеўдаэстраднае шоу?

> Калі грамадства баіцца самавыяўлення добрых эмоцый, яно пачынае хварэць. А чалавек, які страціў жаданне радавацца, ператвараецца ў сляпога выканаўцу чужых і іншым разам небяспечных жаданняў. Дык ці не час навучыцца радавацца не па загадзе, а ад таго, што ў сям'і тваёй усё добра, што ўраджай сабраны неблагі і будучыня тваіх дзяцей — бясхмарная?

Думаецца, каб пазбегнуць усяго гэтага, уключыць варта найперш заканадаўчыя рычагі, каб святы ладзіць не толькі на вуліцах ды пляцах, але і на асабістых падворках. Урэшце, а чаму моладзь не можа правесці нейкую канцэртную рок-акцыю дзесьці ў гаражы ці ангары? Калі, натуральна, мэты гэтых акцый — творчая самарэалізацыя, выказванне мовай музыкі добрых і гуманных пачуццяў, прага элементарнай радасці ад сумеснага баўлення часу. І менавіта заканадаўства павінна ставіць нас у строгія рамкі гарантаванай бяспекі для ўдзельнікаў такіх мерапрыемстваў. Якасць свята — і ў гэтым таксама.

Калі ж грамадства баіцца самавыяўлення добрых эмоцый, яно пачынае хварэць. А чалавек, які страціў жаданне радавацца, ператвараецца ў сляпога выканаўцу чужых і іншым разам небяспечных жаданняў. Дык ці не час навучыцца радавацца ад таго, што ў сям'і тваёй усё добра, што ўраджай сабраны неблагі і будучыня тваіх дзяцей — бясхмарная?..

На сваёй аграсядзібе мы распачынаем фестываль "Бітлзфэст". Запланавана, што ён адбудзецца 31 мая. Прагучыць пазітыўная інтэрнацыянальная музыка. Фальклорны фэст "Вольнае паветра" пройдзе пад час Купалля. Замежных гасцей не будзе, бо мы не ў стане аплаціць ім канцэртныя пасведчанні. Так што выступяць толькі айчынныя гурты, якія з адказнасцю ставяцца да захавання нашай традыцыйнай мастацкай спадчыны. Дарэчы, калі б і па сёння існавалі мулявінскія "Песняры" (менавіта мулявінскія), мы абавязкова запрасілі б на фэст і іх… У нас не будзе ні кроплі гарэлкі, і экалогія наўкола хутара "Шаблі" застанецца некранутай. Мы ў чарговы раз будзем вучыцца радавацца...

Будзем на сувязі!

Паважаныя чытачы!
Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77,
альбо на электронную скрыню kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце на
facebook.com/kimpressby, vk.com/kimpressby

Этна “вымываецца” за мяжой. А ў нас?..

Чалавек, які разгадаў таямніцу старажытнага абраду “Страла”

Юрый ВЫДРОНАК — фігура знакавая для нашай фольк-рок-музыкі. У 1992 годзе ён быў адным са стваральнікаў гурта “Палац” і стаў яго мастацкім кіраўніком. У 1996-м, у рамках фольк-мадэрн-студыі “Палац” ініцыяваў нараджэнне на свет трыа “Kriwi”, а ў 1999-м і з’явіўся той самы калектыў “Ur’ia”, у якім Выдронак нарэшце цалкам змог рэалізоўваць менавіта свае задумкі. З 2000 года артыст з’яўляецца арганізатарам мінскіх фестываляў “Таўкачыкі на Юр’я”, чарговы з якіх пройдзе 23 красавіка. І ўяўляць з сябе ён будзе не, як звычайна, набор канцэртных нумароў (сярод удзельнікаў фэсту — гурты “Ветах”, “Альтанка”, “Бан-Жвірба”, “Хоха бэнд”, Наталля Матыліцкая ды іншыя), а сапраўднае шоу. Напрыклад, адбудзецца рэканструкцыя абраду “Юр’я”, для чаго з Любаншчыны прывязуць выпечаны каравай.

Алег КЛІМАЎ

Што такое “Ur’ia”?

— Па маіх адчуваннях, адной з прычын твайго сыходу з, дапусцім, “Палаца” стала тое, што ў нейкі момант ён пачаў усё часцей і часцей выкарыстоўваць на канцэртах дапаможныя інструментальныя фанаграмы...

— Адкажу так: мне стала цесна ў рамках “Палаца”. Музыку і аранжыроўкі для яго я рабіў з улікам моды 1980 — 1990-х. У мяне з’явілася новая музыка і, адпаведна, яе бачанне. Захацелася стварыць новы праект з больш канцэптуальнай назвай, шырокім мастацкім дыяпазонам, багацейшай палітрай фарбаў, хацелася ўвесці прыгожыя і якасныя жаночыя вакалы, касцюмы, хацелася спяваць самому, асабліва хацелася ўнесці фарбу свабоды, радасці, драйву і духу 1970-х. Ніколі не задаваў сабе пытанне: чаму зоркі 70-х сёння гучаць не так, як раней, гэта значыць — гучаць значна горш? А адказ наступны: уся справа ў станоўчых гармоніках лямпавай апаратуры, якую цяпер ужо практычна не выкарыстоўваюць. Але гэта, канешне ж, не самае галоўнае. Знік дух свабоды ў творчасці, артыстаў загналі ў рамкі вузкіх фарматаў, таму што так зручны выдаўцу: менш затраты — большы прыбытак. Раней добрага артыста рыхтаваць трэба было доўга, укладаючы ў яго шмат цярпення і сродкаў, а цяпер і спяваць не абавязкова — аўтацюнінг усё выправіць, а медыя пераканаюць, што артыст — добры і толькі яго трэба слухаць. Праект “Ur’ia” быў створаны для жывой, энергічнай музыкі, якую мы адразу ж павезлі па Еўропе, і, скажу без залішняй сціпласці, яна зрабіла на тамтэйшую публіку ашаламляльнае ўражанне. Дык што такое “Ur’ia”, пытаешся? Гэта рок-драйв і рок-эстэтыка 1960 — 1970-х, этнічныя інструменты, рытуальная песенная архаіка, гарлавыя спевы.

— Перапыню цябе. Я таксама памятаю ўзрушэнне, якое зведаў: досыць агрэсіўная інструментальная падача, напор, экзатычныя інструменты і аўтэнтычныя спевы — натуральна, беларускія, народаў іншых краін...

— Канцэпт “Ur’ia” яшчэ і ў пошуку кропак судакранання розных культур, нават пракультур. Як практык-фалькларыст і этнограф я прыйшоў да высновы, што такія кропкі ў беларускай культуры ёсць, да прыкладу, з культурай гуральнай (*Больш пашыраны варыянт назвы — гуральская.* — **А.К.**) — тых жа гуцулаў, з румынскай, старажытнай егіпецкай, індыйскай... Больш за тое, скажу і вось што: у нас сапраўды з рускімі агульны культурны корань, як і са славянамі наогул. Дарэчы, першы сольнік на радзіме ў гурта адбыўся толькі ў 2012 годзе ў Канцэртнай зале “Мінск”...

— Чаму так позна?

— Бо нас, у тым выглядзе, як праект задумваўся, як ён павінен выглядаць і слухацца, у Беларусі ні асвятліць, ні агучыць не могуць: і ўсё ж я рызыкнуў. Няма апаратуры, спецыялістаў, як за мяжой: уяўляеш, на сцэне рок-калектыў плюс струнны квартэт, хор, балет, шмат этнаінструментаў, усё падпарадкавана скразной драматургіі, а на выхадзе — заводкі маніторaў, гукавы дысбаланс ды іншае, да таго падобнае...

“Матрошкі з гармонікамі”

— А як у Еўропе з канцэртамі?

— З фестывалямі стала горш. Змяніліся ўмовы для запрашэння калектываў. Калі раней арганізатары аплачвалі ганарар, праезд і пражыванне, то цяпер яны высылаюць толькі запрашэнне. Артысты з ім павінны ісці ў спецыяльны фонд або Міністэрства культуры сваёй краіны, каб атрымаць грант на паездку. Што да канцэртных агенцтваў, то там таксама шмат змен. Ім патрэбны танныя артысты з таннай музыкай, каб зарабіць на іх больш. Сур’ёзная этнічная музыка з фестываляў “вымываецца” — застаюцца, што называецца, “матрошкі з гармонікамі”. Калі раней такія форумы выконвалі культуралагічную місію — знаёмілі публіку з каранёвым мастацтвам, — то сёння ўсё паставілі на эканамічныя рэйкі. І такім чынам людзей адвучылі ад натуральнага музычнага прадукту, які трэба спачатку асцярожна пакаштаваць, потым — адчуць яго смак, затым, смакуючы, старанна “пераражаваць”. На змену ж прыйшоў фастфуд — “музыка хуткага прыгатавання”. Лічу, тое — катастрафічнае падзенне інтэлектуальнага ўзроўню.

— Некалькі гадоў таму, дарэчы, вы адмовіліся ад удзелу ў фольк-фестывалі на адкрытым паветры. Хадзілі чуткі, што гурт “зарадзіў” непад’ёмны для арганізатараў “цэннік”...

— Глупства, вядома. Гурту як заяўленаму хэдлайнеру прапанавалі выступіць днём. Табе шмат вядома хэдлайнераў, якія выступаюць у сярэдзіне зборнага мерапрыемства? Нам жа, як я ўжо казаў, у любым выпадку неабходна прафесійнае святло — нават у такіх умовах, каб глядач атрымаў хаця б мінімальнае ўяўленне аб шоу “Ur’ia”. І патрэбна публіка, а не тыя колькі дзясяткаў чалавек, якія апынуліся б перад сцэнай днём. На тым фестывалі не было і грымёрак для артыстаў, а я так не прывык...

— Як правіла, кожны фестываль дэкларуе нейкія мэты... “Таўкачыкі” — не выключэнне?

— Яго ідэя заключаецца ў тым, каб не проста адзначыць свята, а звярнуць увагу людзей на тое, што яны забылі традыцыі, лічы, уцяклі ад прыроды. І такая няпамятлівасць прыводзіць да таго, што на змену адным каштоўнасцям, натуральным, жывым, прыходзяць іншыя. Галоўная з іх сёння — катастрафічная для духу чалавека: грошы...

Юрый Выдронак пад час адных з “Таўкачыкаў”. / Фота Вольгі КЛЯШЧУК

Вярнуць да вытокаў

— Вось пра цябе распавядаюць: Выдронак, маўляў, адгарадзіўся ад усіх сцяной, “сядзіць” у бярлозе, перыядычна вылазіць на святло — і зноў назад...

— Доля праўды ў гэтым ёсць. Я выбіраюся з дому на беразе Дняпра, у якім жыву, выключна па справе. Напрыклад, на здымкі дакументальных этнаграфічных фільмаў або на арганізацыю фестывалю.

— На беларускім тэлебачанні мы можам убачыць твае карціны?

— Збольшага — у Інтэрнэце. Гэта сапраўды цікавае, пазнаваўчае кіно пра старажытныя абрады. Прычым мне ўдалося зафіксаваць на плёнку анамальную з’яву! Я, мяркую, разгадаў таямніцу старажытнага абраду “Страла”, прысвечанага Перуну, заснаванага на ахвяраванні яму. Мая гіпотэза заключаецца ў тым, што гэта былі чалавечыя ахвяры, дакладней — самаахвяраванне.

— Жах...

— Жах далей будзе. Ёсць такая песня, якую я выкарыстаў яшчэ ў рэпертуары “Палаца”: “Як пушчу стралу па ўсяму сялу. / Ты ляці, страла, да і ўздоўж сяла. / Ты забі, страла, добра молайца. / Па тым молайцы нікаму плакаці. / Матка старэнька, сястра маленька. / Жонка молада, у карагод пайшла...” І гэтак далей. Я ніяк не мог зразумець яе сэнс: нейкі набор фраз, і ў фалькларыстаў не сустракаў тлумачэнні. І здымалі мы бабуль у Веткаўскім раёне ў вёсцы Янова. Заспявалі яны яшчэ адну песню-замову з рытуалу “Пахаванне стралы” пад назвай “Падуйце, вятры буйныя...”, гляджу — сапраўды падымаецца вецер! Гэта бабулі яго выклікалі! Для чаго? Каб ён зганяў хмары. Хмары сутыкаюцца — нараджаецца маланка. Маланка — гэта страла, якой патрэбен громаадвод, тая самая ахвяра, у якую маланка і трапляе — добры маладзец, па кім няма каму плакаць: матка старэнька, жонка ў карагод пайшла, такім чынам парушыўшы традыцыі...

Наконт беларускага тэлебачання. Я прапаную ўжо некалькі гадоў (і сустракаўся з той нагоды са старшынём Белтэлерадыёкампаніі Генадзем Давыдзькам) стварэнне тэлевізійнага шоу “Таўкачыкі”, а кампанія адказвае, што грошай у іх няма, і, наогул, стварэнне такой праграмы мусіць фінансаваць, хутчэй, Міністэрства культуры. Таму пытанне з праграмай пакуль так і вісіць. Як мне бачыцца, такое тэлешоу ўключала б звесткі пра славутасці, тапаніміку, мову, народную медыцыну, традыцыйныя рамёствы, канцэрты айчынных і замежных зорак, відэакліпы, экспедыцыйныя здымкі... Галоўнай асаблівасцю хочацца зрабіць удзел у праекце людзей з народу, якія паказвалі б абрады, песні, танцы, рамёствы ў аўтэнтычным выглядзе.

— А музычную архаіку якіх куткоў Беларусі ты больш за ўсё выкарыстоўваеш у творчасці?

— Гомельшчыны, Брэстчыны і Магілёўшчыны: там больш засталося цікавага для мяне аўтэнтычнага матэрыялу, са своеасаблівымі мелізмамі. А для выканання песен Гомельскай вобласці патрабуецца валодаць шырокім вакальным дыяпазонам, яны складаныя, а мяне цяжкасці заводзяць.

— Прапаную вярнуцца да Дняпра...

— Ці саджаю я ля дома дрэвы? Саджаю. Ці бяру сякеру ў рукі? Здараецца. Я жыву прыродным жыццём... Спадзяюся, сёлета выйдзе альбом “Ur’ia”. Працую над стварэннем сур’ёзнага твора — оперы. Да таго ж хочацца запісаць рэшткі этнаграфічнага матэрыялу па краіне. Паколькі я першым у свой час распачаў лічбавы аўдыя- і відэазапіс этнаматэрыялу, маю досвед працы ў якасці навуковага супрацоўніка ды рэстаўратара гуку, з’яўляюся этнографам-практыкам, валодаю ўсімі магчымасцямі рабіць гэта прафесійна. І, дарэчы, хачу звярнуцца праз вашу газету да ўсіх, хто можа дапамагчы фінансаваннем прафесійнай экспедыцыі, каб захаваць рэшткі нашай культурнай спадчыны.

— І — “кантрольнае” пытанне. Ты сустракаў людзей, якія з падазрэннем ставіліся да таго, што робіць “Ur’ia”? Хочаце ці не, але атрымліваецца так, што вы папулярызуеце веды пра дахрысціянскую эпоху, а да яе ў гісторыкаў стаўленне рознае...

— “Ur’ia” прапагандуе культуру нашых продкаў, нацыянальныя традыцыі. Калектыў названы ў гонар старажытнага свята славянскага народнага календара. У жывой традыцыі гэтае свята і абрад яшчэ існуюць на Тураўшчыне, маюць статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і знаходзяцца пад аховай UNESCO. Часы змяняюцца, а культура, якая ўзнікла не дзве і не тры тысячы гадоў таму, усё яшчэ жывая. Гэта яна спарадзіла цяперашнюю цывілізацыю, а забываючы, адмаўляючы, абсякаючы свае карані, мы губім самі сябе. “Ur’ia” пасільна спрабуе вярнуць людзей да вытокаў. Выратаванне там, як мне бачыцца...

К

Сур’ёзная этнічная музыка з фестываляў “вымываецца” — застаюцца, што называецца, **“матрошкі з гармонікамі”**. Сёння ўсё паставілі на эканамічныя рэйкі. І такім чынам людзей адвучылі ад натуральнага музычнага прадукту, які трэба спачатку асцярожна пакаштаваць, потым — адчуць яго смак, затым, смакуючы, старанна “пераражаваць”. На змену ж прыйшоў фастфуд — “музыка хуткага прыгатавання”...

У Беларусі бываем (ня)часта...

Дык няўжо так "добра там, дзе нас няма"? Даследаванне "К"

Частка III

Гэтым матэрыялам мы працягваем тэму, закранутую ў папярэдніх нумарах нашай газеты (№№ 13 і 15): чаму беларускія музыканты з'язджаюць з краіны і як складаецца іх жыццё ўдалечыні ад радзімы. Перад вамі — чарговая порцыя нявыдуманых аповедаў ад айчынных выканаўцаў, якія, пакаштаваўшы замежных "хлеба і відовішчаў", усё ж вярнуліся ў Беларусь.

Алег КЛІМАЎ

Перспектыўны Патліс: павароту не здарылася

— У 1999 годзе ўдзельнікі гурта "Новы Іерусалім", дзе я спяваў, — успамінае Аляксандр ПАТЛІС, яго колішні лідар, — атрымалі працоўныя візы ў ЗША і разам з жонкамі ды дзецьмі перабраліся ў гэтую краіну, па якой да таго калектыў часам гастраляваў.

Асталявацца там вырашылі сур'ёзна — у штаце Нью-Ёрк у горадзе Рочэстэр нам нават далі базу. Пачалася больш насычаная канцэртная дзейнасць, калясілі з уласнай апаратурай па Амерыцы на двух аўтобусах. Тады ж паступіла і прапанова аб кантракце ад вядомага мясцовага прадзюсара. У выпадку нашай згоды нам вылучылі б саўндпрадзюсараў, студыю, асабіста мне як вакалісту павінны былі наняць выкладчыка па англійскай мове. Мы абмяркоўвалі-абмяркоўвалі, як паступіць, але адзінага рашэння так і не прынялі. Мне было цікава пакаштаваць таго артыстычнага жыцця, да таго ж узрост — 33 гады... Але павароту не здарылася...

Аляксандр не бярэцца гадаць, што было б з камандай, каб засталася яна ў Штатах. Мо аднойчы Патліс, а затым некаторыя іншыя музыканты не сышлі б з гурта. Не выключана і тое, што ансамбль падарожнічаў бы сёння па свеце. Але і без усялякіх фестываляў артыст задаволены тым, што ў яго шмат канцэртаў па ўсім былым Саюзе — ад Далёкага Усходу да Баку...

"Дзялок" Хлястоў: Бахрэйн быў і... застаўся

Лёс і абставіны закінулі Аляксея ХЛЯСТОВА на сыходзе мінулага стагоддзя ў дзяржаву, дзе лад кардынальна адрозніваўся ад нашага.

— Напрыканцы 1996 года я праз знаёмага агента ўладкаваўся на працу ў адзін з пяцізоркавых гатэляў Бахрэйна, у якім было з пяць начных клубаў, — распавядае спявак. — Думаў, буду там выступаць для англамоўнай публікі, але высветлілася, што асноўны кантынгент іх наведвальнікаў — арабы. Давялося, з дапамогай новых мясцовых "прыяцеляў", "асвойваць", транскрыбіруючы на рускую мову, рэпертуар ліванскі, кувейцкі, алжырскі, егіпецкі, іранскі, аравійскі ды іншы. А песні тыя вельмі складаныя, эпічныя, такая своеасаблівая этніка. Трэба было навучыцца правільнаму прыдыханню і вымаўленню нават не слоў, а літар. Трэба было ведаць, пра што песні. А яшчэ пры іх выкананні рабіць нейкія характэрныя жэсты: прыціскаць рукі да сэрца, разводзіць іх у бакі пэўным чынам... Маю праграму на 70 працэнтаў і складалі такія рэчы — незвычайныя, з выразным барабанным бітам, эмацыйныя, а астатнія 30 — фармат MTV: для гасцей і пастаяльцаў з Еўропы ды Амерыкі. А праграму, дарэчы, прымалі ды зацвярджалі прадстаўнікі тамтэйшага Міністэрства турызму!..

У 2002-м у Бахрэйне адбыліся вялікія змены. Тое датычылася заканадаўства ў частцы знаходжання ў краіне замежнікаў. Месяцы чатыры ў Аляксея практычна не было выступленняў. Стала горш з заробкамі: чаявыя адмянілі... Ды і руціна яму надакучыла: увесь час гатэль, гатэль, гатэль, што неймаверна засмучала. Нягледзячы на поўны пансіён, яго накрыла пастаянная млявапраяўная дэпрэсія. І на пачатку лютага 2003 года Хлястоў з жонкай з'ехаў у Мінск, спадзеючыся праз месяц вярнуцца назад.

— З'язджаў — усё было дрэнна ў нас з шоу-бізнесам, — усміхаецца выканаўца. — Прыехаў — ён усё так жа дрэйфуе па вельмі павольнай плыні. А я ўжо стаў "дзялком", стаў разбірацца, як і што правільна арганізаваць у гэтай сферы, ды і проста прывык працаваць на сябе! Увогуле, засумаваў ізноў я і на радзіме. Каб не сустрэча з Аляксандрам Ціхановічам, які прывёў мяне на тэлебачанне, не супрацоўніцтва з аўтарамі песень, што нечакана з'явілася, не ратацыі на радыё і ТБ, хто ведае, як далей усё склалася б. Да верасня 2003-га я зразумеў, што здабыў у Беларусі папулярнасць. А Бахрэйн... Ён застаўся са мной назаўжды. Часцінка яго культуры жыве ўва мне...

Магчымасці Лапкоўскага: на некалькі гарадоў

— Я часта з'язджаю з краіны, але на непрацяглыя тэрміны, — кажа лідар гурта "Цвет алоэ" Сяргей ЛАПКОЎСКІ. — У 2011 годзе некалькі месяцаў правёў у Маскве — шукаў аднадумцаў па творчасці, але, на жаль, на той час не было тых людзей, якія маглі б прапанаваць штонебудзь пэўнае ў плане кар'еры.



Тое ж самае магу сказаць і пра ЗША, дзе я правёў месяц, сустракаючыся з прадстаўнікамі лэйблаў, але нейкіх дамоўленасцей у выніку гэтых сустрэч не з'явілася. І ўсё ж там — за межамі Беларусі — мы толькі госці, а тут — ужо артысты. На дадзены момант ізноў ёсць магчымасць пераехаць у расійскую сталіцу, ужо фарміруецца бізнес-план на год па прасоўванні нашага гурта на тамтэйшы рынак...

Сяргей настолькі ўлюблены ў Мінск і Беларусь, што з'язджаць ад нас назаўсёды ён не плануе, а вось працаваць і жыць на некалькі гарадоў — гэтага яму ў сувязі з родам дзейнасці, мяркуючы па ўсім, не пазбегнуць...

Грунтоўны Міцько: "пакуль будую дом"

У Маскве спрабаваў асталявацца і фронтмен "Лепрыконсаў" Ілья МІЦЬКО. Ды сталіца іншай славянскай дзяржавы яго вабіла-вабіла, ды не "вывабіла" з роднай "норкі".

— Я пражыў у Маскве (з рэдкімі наездамі ў Мінск) з 2000 па 2003 год: у гурта быў кантракт з буйной студыяй, — дзеліцца Ілья. — Потым вярнуўся ў Мінск, і, пабыўшы дома годзік, адправіўся ў Кіеў, дзе працаваў да 2007-га на музычным тэлеканале вядучым. Не хвалююся, што так усё склалася, на ўсё свой час. Зараз я заглыблены ў сямейныя клопаты, будую дом, гэта мне дае нашмат больш задавальнення, чым шоу-бізнес, тусоўкі. Калі з'явіцца выразна акрэсленая перспектыва, то гатовы зноў паехаць. Я і так практычна кожны тыдзень бываю за мяжой на гастролях, з працай у нас па-ранейшаму справы ідуць грунтоўна...

Фіналіст Рудэнка: адмены ў Польшчы і Расіі

Віктар РУДЭНКА з калектыву "Rostany" і былы вакаліст гурта "Dali" таксама заглядаўся ў бок славянскай краіны:

— У свой час гурт "Dali" пачаў супрацоўнічаць з польскім прадзюсарам Ігарам Зныкам — ён стаў у нас укладваць сродкі. Але амаль адразу пасля першай такой інвестыцыі, калі мы за яго кошт прыехалі ў Польшчу і ўдзельнічалі ад гэтай краіны ў адборачным туры на "Еўрабачанне" (прайшоўшы ў фінал, дарэчы), ён па асабістых прычынах згарнуў сваю дзейнасць... Мы не мелі ніякіх іншых кантактаў у Польшчы, таму праца і не прадоўжылася. Аналагічная сітуацыя была і з Расіяй. Мы дамовіліся з добрым чалавекам, тэлевізійным прадзюсарам, які пачаў намі займацца. Але нечакана яго кампанія збанкрутавала, і ён засяродзіўся толькі на ўласным выжыванні...

Канадскі Івашын: паверыў — не праверыў

Ну, і цэлую эпапею ўяўляюць з сябе замежныя пакуты экс-клавішніка гурта "Нейра дзюбель" Максіма ІВАШЫНА.

— У верасні 2004-га я стаў... не, не грамадзянінам Краіны Кляновага Ліста, але тамтэйшым жыхаром, — пачынае ён свой аповед. — З прыцэлам на, зразумелая справа, паспяховую кар'еру і, у рэшце рэшт, ужо згаданае грамадзянства. Балазе паказчыкі да асабістага росквіту былі сур'ёзныя: ступень аднаго з лепшых факультэтаў журналістыкі ЗША, адэкватная англійская мова, але галоўнае — жаданне і сілы змяніць жыццё ў лепшы бок. На жаль, адзначу забягаючы наперад, амбіцыі не ўрэчаісніліся...

Маю мужнасць прызнаць: збольшага мая канадская прыгода была памылкай, вопытам відавочна негатыўным. Я, што называецца, не зрабіў "хатняе заданне". Тыя, хто прапанаваў мне выезд, ахарактарызавалі Канаду як "тыя ж Штаты, толькі з еўрапейскім акцэнтам". Я ў адказ — паверыў, ды не праверыў... А высветлілася, што канадскія рэаліі... шмат у чым падобныя нават да беларускіх. Рынак — маленькі, да таго ж стары, стабільны, канкурэнцыя — велізарная, пры гэтым справы ідуць даволі млява. Не, кіроўцам-будаўнікам-праграмістам там справа знойдзецца… Разумеў, што на пасаду намесніка рэдактара мяне наўрад ці запросяць, — і не імкнуўся. Але спачатку працы для хоць бы падобных спецыяльнасцей у вялікім полі масавай камунікацыі не было зусім, і гэта вельмі бянтэжыла, калі не сказаць — палохала...

Кар'ерны рост кар'ерным ростам, але менавіта ў Канадзе Максім шчыльна стаў займацца сувязямі з грамадскасцю, чым зарабляе на хлеб і сёння. Ды, памятаючы пра цяжкі пачатак і агульныя негатыўныя ўражанні, як толькі зразумеў, што дасягнуў у сваёй дзейнасці столі і далей не зможа развівацца (а на той момант яму яшчэ не было сарака гадоў!), без шкадавання кінуў усё і з'ехаў... у Польшчу працаваць на радыё. А з часам вярнуўся і ў Беларусь.

— Затое ў галіне культуры мой досвед аказаўся вельмі цікавым, — шчыра прызнаецца Максім. — Папершае, кіно. Канада для кінаіндустрыі Штатаў амаль тое ж, што Мінск — для Масквы. "Сакрэтныя матэрыялы", як мне (па сакрэце!) сказалі, амаль цалкам здымаліся ў ваколіцах Ванкувера. Адпаведна, попыт на масоўку ёсць заўсёды: многія імігранты, нават зусім далёкія ад кіно, так першыя грошы і зарабляюць. А далей — справа твайго таленту і шанцавання. У выніку ў мяне было двое агентаў (зразумела, не толькі маіх асабістых), праз якіх я трапіў у некалькі серыялаў "Discovery" і "BBC". З Майклам Медсэнам пагутарыў пра літаратуру ў паўзе паміж дублямі. Ад Майкла Дугласа (здымалі карціну "Ахоўнік" пра гісторыі вакол Белага Дома) стаяў літаральна за метр, ад Кім Бейсінгер — за тры... Каліфарнійскі следчы, афіцэр канадскай паліцыі, сербскі апалчэнец і, вядома ж, "новыя рускія" ды бандзюганы тых жа часоў — усё гэта ў маім, не пабаюся сказаць, акцёрскім багажы. Але галоўнае — велізарны, разнастайны і пазітыўны вопыт, які, дарэчы, прыдаўся і тут: раз у месяц я сапраўды на адной з нашых здымачных пляцовак...

Было ў Івашына сёе-тое цікавае і ў плане музыкі. Да 2004 года яго праца ў "Нейра дзюбелі" падышла да лагічнага завяршэння. Але іграць хацелася, і інструмент ён павёз з сабой у Таронта, дзе прыняў удзел у праекце... лепшых канадскіх дваінікоў Элвіса Прэслі. Хлопцы (іх двое, таму і праект называўся "Double Trouble") ставіліся да справы вельмі адказна. Інтанацыі, унікальная пластыка Элвіса, парыкі з натуральных валасоў, сцэнічныя касцюмы за паўтары тысячы долараў — язык не павернецца назваць гэта "простым хобі". Намаганні былі ўзнагароджаны: "Double Trouble" не раз прызнаваліся "лепшымі элвісамі Канады", а на Сусветным конкурсе двайнікоў Прэслі ў Лас-Вегасе хоць і не перамагалі, але стаялі на п'едэстале...

— І, з выканальніцкага пункта гледжання, мне было чым заняцца ў тым праекце, — заканчвае сваю споведзь Максім. — Здавалася б, рок-н-рол, тры акорды — што можа быць прасцей? Але ж у песнях Прэслі мноства цікавых нюансаў; разабраўся ў іх — стаў лепш разумець музыку Паўночнай Амерыкі.

Калі я і вярнуся ў Канаду, то на пенсіі. А пакуль... З пачатку года я ўжо пяць краін наведаў, прычым у асноўным з дзелавымі мэтамі!..

■■■

Паважаныя чытачы! У адным з бліжэйшых нумароў "К" чакае заканчэнне нашага аповеду пра "невозвращенцев", "возвращенцев" і тых, хто так і не рызыкнуў (і чаму прыняў такое рашэнне) пачаць усё спачатку недзе там, за пагранічнымі слупамі. Пра апошнія выпадкі, уласна, і будзе заключны матэрыял.

К

Пра тое, ці варта шукаць прарыву за мяжой айчынным выканаўцам, разважае PR-менеджар у сферы шоу-бізнесу **на старонцы 13.**

“Куб Малевіча” ў айчынным выкананні

FAQ па выстаўцы “Avant-gARTe. Ад квадрата да аб’екта”

21 красавіка ў Мінску стартуе бадай беспрэцэдэнтная паводле сваіх маштабаў выстаўка сучаснага мастацтва “Avant-gARTe. Ад квадрата да аб’екта”. З дапамогай яе куратара — дырэктара Цэнтра сучасных мастацтваў Наталлі ШАРАНГОВІЧ — мы паспрабавалі знайсці адказы на тыя пытанні, якія, трэба меркаваць, непазбежна паўстануць з гэтай нагоды ў неабыякавай публікі.

Ілья СВІРЫН

Што гэта будзе?

Тры вялікія і разнапланавыя выставачныя праекты, якія адбудуцца на трох прынцыпова розных (паводле ўсіх фактараў і градацый вымярэння) пляцоўках.

Па-першае, у Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адкрыецца выстаўка “Сто гадоў беларускага авангарда” — своеасаблівая рэтраспектыва ўсяго “іншага” мастацтва на нашых землях: ад Шагала і прыкладна да Людмілы Русавай. Як адзначыла Наталля Шаранговіч, сто гадоў — гэта адрэзак, без сумневу, вельмі ўмоўны і таму спрэчны. Але тут, натуральна, важны сам пасыл: беларускі авангард нарадзіўся не сёння і нават не ўчора.

Па-другое, у будынку былога павільёна БелЭКСПА на праспекце Пераможцаў, 14 (між іншым, выбітным узоры ўльтрасучаснай для свайго часу архітэктуры — насуперак усім шматлікім мянушкам, прыдуманым для гэтага гмаху мінчанамі) адбудзецца маштабная рэпрэзентацыя ўласна цяперашняга беларускага мастацтва.

— Гэта ці не самая вялікая зала ў краіне, дзе можна ладзіць мастацкія выстаўкі, — кажа Наталля Шаранговіч. — Прастора, трэба адзначыць, даволі складаная, і таму мы прыкладаем шмат намаганняў для таго, каб у выніку атрымалася цэласная экспазіцыя...

Урэшце, трэцяй лакацыяй праекта стане плошча Якуба Коласа. Музей сучаснага выяўленчага мастацтва ладзіць там выстаўкі пад адкрытым небам ужо не першы год, аднак гэтым разам мінакі здолеюць убачыць не творы класікаў (натуральна, у выглядзе рэпрадукцый), але менавіта сучаснікаў: васьмі графікаў і васьмі жывапісцаў.

Хто і як ажыццяўляў адбор удзельнікаў?

Па словах Наталлі Шаранговіч, прынцып “open call”, калі любы ахвотны можа прапанаваць свае работы, у дадзеным выпадку не прымяняўся. Фактар куратарскай рызыкі (ды, разам з ёй, і адказнасці), без сумневу, прысутнічае. У пэўнай меры, ён амартызуецца самім складам куратарскай групы. Па словах Наталлі Шаранговіч, у яе ўвайшлі перадусім практыкі ў галіне арганізацыі сённяшняга арт-працэсу: старшыня Беларускага саюза дызайнераў Дзмітрый Сурскі, дырэктар галерэі “Універсітэт культуры” Наталля Барсукова, дырэктар галерэі “Палац мастацтва” Аляксандр Зінкевіч...

Паколькі пытанне, што ж такое сучаснае мастацтва, па-ранейшаму не дае многім спакою, пэўныя дыскусіі адносна вынікаў адбору проста непазбежныя. Як падаецца, куратар ставіў сабе за мэту зрабіць максімальна адэкватны “зрэз” таго арт-працэсу, што віруе ля родных пенатаў, не надта расстаўляючы свае суб’ектыўныя акцэнты ды не спрабуючы скласці разрозненыя “асобныя сюжэты” ў нейкі валюнтарысцкі метанаратыў.

У тым, што спрэчкі абавязкова будуць, сумнявацца не выпадае. Нават сам анонс выстаўкі на адным з папулярных парталаў спарадзіў цэлую плойму мастацтвазнаўчых каментаў у агульнай танальнасці “не глядзеў, але асуджаю”. Палярныя меркаванні “па сабжы” будуць выказвацца бясконца, але па наведанні выстаўкі яны, прынамсі, будуць мець пад сабой змястоўнае апірышча.

Калі “гістарычная” частка ўключае творы прыблізна 70 мастакоў, дык у асноўнай іх будзе прадстаўлена не менш за 200 — плюс тэатральныя і музычныя калектывы, мадэльеры, перформеры... Нават цяжка ўявіць рэцыпіента, якому б прыйшоўся да густу ўвесь гэты неабсяжны арт-масіў! Ды затое кожны знойдзе ў ім для сябе хоць нешта прывабнае.

Што да “вулічнай” выстаўкі... Па словах куратара, абраныя аўтары — людзі зусім не выпадковыя ў нашым мастацтве. Маўляў, абазнаныя гледачы ніводнаму з гэтых прозвішчаў не здзівяцца. Але колькі іх, абазнаных? Тым больш, у цэнтр увагі гэтым разам трапіў такі “камерны” від мастацтва, як графіка. Бо калі адзін са ста мінакоў яшчэ і прыгадае хоць пару прозвішчаў беларускіх жывапісцаў, дык імёны графікаў — скажам Рамана Сустава або Юрыя Алісіевіча — не назаве, мабыць, ніхто.

Наталля Шаранговіч звяртае ўвагу і на іншую акалічнасць: графічныя работы невялікага памеру будуць трансфармаваны ў зусім іншы жанр — плакат. Адпаведна, артэфакты з калекцыі Музея сучаснага выяўленчага мастацтва і сапраўды набудуць іншае вымярэнне — і творчае, і публічнае.

Ці будуць “прэм’еры?”

Па вялікім рахунку, выстаўка ў будынку на праспекце Пераможцаў стане своеасаблівым дайджэстам мастацкага жыцця Беларусі апошніх гадоў — альбо, калі хочаце, “папуры” на яго. Экспазіцыя ўвабрала ў сябе тыя праекты, што паспелі ўжо прагучаць: “Тэхнаарт”, “Пастулат”, айчынны павільён на апошнім Маскоўскім біенале... Адпаведна, заўсёднікі ўбачаць там шмат знаёмых твораў. Але ж наўрад ці будуць надта засмучацца з той прычыны — усё ж гэта “the best”...

А “незаўсёднікі”? Няма сумневу ў тым, што ў працэнтным вымярэнні іх лік будзе куды большы, прычым гутарка вядзецца не толькі пра замежных турыстаў. Прaглядзеўшы гэтую выстаўку, яны атрымаюць унікальную магчымасць усяго за адзін дзень сфармуляваць для сябе адказ на ўжо згаданае вышэй пытанне: “Што ж такое сучаснае беларускае мастацтва?”

У той самы час, выставачная прастора будзе змяшчаць і шмат новых праектаў, створаных і прызначаных менавіта для “Avant-gARTe”. Прыкладам, архітэктар Міхаіл Шыкаў падрыхтаваў своеасаблівую інтэрактыўную інсталяцыю, збудаваную на ілюзіях успрыняцця, узаемадзеянне з якой глядач распачне яшчэ на лесвіцы. А ў самой зале ўвагу да сябе будзе прыцягваць твор Канстанціна Вашчанкі, які наглядна ўвасабляе назву выстаўкі — “Ад квадрата да аб’екта”: небезвядомы артэфакт Малевіча набудзе новае прасторавае вымярэнне ды стане кубам з гранямі двухметровай вышыні.

— Гэтая работа, якая нібыта задае танальнасць усёй выстаўцы, выдатна адлюстроўвае пашырэнне плоскасці ў прастору, памкненне творцаў да няспыннага пераадольвання межаў, — кажа Наталля Шаранговіч. — Сёння ў беларускім мастацтве адбываецца не проста “змяшэнне жанраў”, але і набыццё імі новых вымярэнняў. Напрыклад, графіка ператвараецца ў калаж, скульптура становіцца арт-аб’ектам... Інсталяцыя нібы артыкулюе гэты бясконцы рух да новых форм і сэнсаў.

Яго адлюстраваннем стане і праект Канстанціна Селіханава, які даўно і плённа спалучае скульптуру з канцэптуальным мастацтвам. Яшчэ адна вядомая мастачка, Зоя Луцэвіч, спецыяльна для выстаўкі паспрабуе правесці паралелі паміж супрэматычнымі выявамі ды народнымі карункамі. Ну, і, ужо па традыцыі, сюрпрызы чакаюцца ад сталых іх “пастаўшчыкоў” — Уладзіміра Цэслера ды Руслана Вашкевіча.

Ці будуць прадстаўлены рэгіёны?

Пытанне і сапраўды немалаважнае: “дыскрымінацыя паводле прапіскі” ў беларускім мастацкім жыцці па-ранейшаму даецца ў знакі, не дэ-юрэ, вядома, але дэ-факта. Важнай асаблівасцю Першага Мінскага трыенале, які адбыўся ў тым самым будынку на праспекце Пераможцаў, стала менавіта ўзважаная ды канцэнтраваная ўвага да творцаў, якія жывуць па-за Мінскам, — і, як высветлілася, увага зусім недарэмная. Многія наведвальнікі са сталіцы рабілі “адкрыцці” выключна з прычын уласнай неабазнанасці ў тым, што робіцца за яе межамі.

Гэтым разам выстаўка таксама стане папраўдзе “рэспубліканскай”: у кожнай з абласцей быў абраны рэгіянальны асістэнт куратара, які падрыхтаваў пэўную частку экспазіцыі. Прадстаўнікі сучаснага мастацтва знайшліся літаральна ў кожным рэгіёне краіны, але... іх “папуляцыя” мае розныя колькасныя вымярэнні.

— Таму і на выстаўцы розныя вобласці будуць прадстаўлены па-рознаму, — кажа Наталля Шаранговіч. — Прыкладам, у наша тэматычнае поле трапілі толькі трое мастакоў з Магілёўшчыны, а вось у Віцебску, надварот, паўстала сур’ёзнае пытанне: каго ж выбраць? У выніку, віцябчане прэзентуюць ажно два калектыўныя праекты... Вельмі цікавы будзе і праект з Гродна — “Белым па белым”. Гэта таксама эксклюзіў, які робіцца спецыяльна для нашай выстаўкі ды выдатна ўпішацца ў яе ідэйнае рэчышча. Згадайма, якое вялікае значэнне надаваў Малевіч беламу колеру...

Ці будзе выстаўка мець культуралагічны і адукацыйны складнікі?

Наталля Шаранговіч справядліва мяркуе, што “гістарычная” частка выстаўкі мае ўяўляць вялікую цікавасць не толькі для гледачоў, але і для даследчыкаў. Так, прадстаўленыя ў залах МСВМ імёны ўжо добра вядомыя ў тых самых “вузкіх колах”. Але ці не ўпершыню зроблена спроба стварыць своеасаблівую храналогію авангарднага мастацтва на Беларусі: пракласці масткі паміж тымі асобнымі выспачкамі, што спарадычна ўзнікалі цягам XX стагоддзя. І, адпаведна, уявіць гісторыю прадмета не ў выглядзе шэрагу адасобленых з’яў, але як цэласны працэс.

Ці стане плённай такая амбітная спроба? Ці магчыма правесці тыя масткі — праз эпохі ды паміж рознымі пакаленнямі? Гэтае дыскусійнае пытанне будзе абмеркавана пад час аднаго з шэрагу “круглых сталоў”, да правядзення якіх спрычыняцца таксама і журналісты газеты “Культура” ды часопіса “Мастацтва”. Да слова, будзе зладжаны цэлы цыкл дыскусій на розныя тэмы, і да ўдзелу ў іх запрашаюцца ўсе ахвотныя.

Што ж да адукацыйнай праграмы... Па словах Наталлі Шаранговіч, запланаваны аўтарскія экскурсіі: калі сам мастак тлумачыць усім цікаўным, “што ён меў на ўвазе”. Такі папулярны ва ўсім свеце фармат (а ў тым выпадку, калі візуальнае ўвасабленне — толькі надводная частка айсберга, ён асабліва важны) у нас, на жаль, пакуль так і не стаў завядзёнкай. Хочацца верыць, маштабная выстаўка спародзіць новыя трэнды...

Пройдуць паказы стужак пра беларускае ды замежнае мастацтва з іх абмеркаваннем. Каардынатарам імправізаванага кінаклуба з’яўляецца вядомы фотамастак і галерыст Уладзімір Парфянок.

Пры чым тут хакей?

У якасці прэамбулы адказу на гэтае пытанне варта згадаць пра тыя чуткі, што актыўна цыркулююць у мінскім арт-асяродку. Маўляў, выстаўка будзе мець жорсткую тэматычную прывязку, а цэнтральным экспанатам стане вялізная фігура хакеіста. Адкуль паходзяць іх карані, Наталля Шаранговіч меркаваць не бярэцца: пагатоў, чуткі — гэта ўвогуле рэч ірацыянальная...

Як патлумачыла куратар, хлопцаў з клюшкамі ў дні Чэмпіянату можна будзе ўбачыць зусім па іншым адрасе. Ніякіх спецыяльных спорт-праектаў экспазіцыя не прадугледжвае. Яно і зразумела: хакею ў кожным разе бракаваць не будзе, і мастакам наўрад ці мэтазгодна ствараць канкурэнцыю прафесіяналам. А вось што да той тэмы, якую мы ўжо рэгулярна ўздымаем на старонках “К” — культурнай праграмы для гасцей, што дазволіла б ім адпачыць ад шчыльнага графіка матчаў... Выстаўка акурат і павінна паспрыяць запаўненню гэтай, бадай, невычэрпнай у нашых варунках студні. Балазе ад “Мінск-Арэны” да галоўнай лакацыі праекта можна хутка дайсці нават пешшу.

У той самы час, няма сумневу ў тым, што пасыл праекта значна перавышае маштаб “пункта культпраграмы”. Таму і асэнсоўваць яго варта найперш у кантэксце беларускай культурнай прасторы, а зусім не спартыўнай падзеі. А Чэмпіянат свету па хакеі — проста добрая нагода.

Чаму менавіта “авангард”?

На Беларусі гэтае пытанне ўзнікне немінуча, але замежны піяршчык, думаецца, зусім не здзівіўся б такому акцэнту. Справа ў тым, што сярод не надта абазнаных у геаграфіі ды сусветнай гісторыі жыхароў далёкіх краін культура нашай часткі сушы асацыюецца выключна з некалькімі з’явамі, і авангард пачатку XX стагоддзя — акурат адна з іх. Цікавасць да яго цягам апошніх дзесяцігоддзяў мае “хвалепадобны” характар, і нават так сталася, што сёння яна — на грэбені. Пра гэта сведчыць хаця б свежы праект знакамітага Пітэра Грынуэя, які “ажывіў” карціны авангардыстаў у маскоўскім Манежы. Ну, альбо фільм Аляксандра Міты, пра які “К” пісала ўжо. Тым больш, акурат летась “прагрэсіўнае чалавецтва” адзначыла 100-годдзе “Чорнага квадрата”.

— Авангард — гэта тая мастацкая з’ява, што мела глабальны ўплыў на сусветную культуру. Гэта той брэнд, які замежнік разумее без дадатковых тлумачэнняў, — кажа Наталля Шаранговіч. — І не лішнім будзе нагадаць пра тое, што ён нараджаўся, у тым ліку, і на тэрыторыі Беларусі...

Зрэшты, нехта пра гэта нагадвае пастаянна. Яшчэ напрыканцы 80-х гадоў мінулага стагоддзя — як толькі ў паветры патыхнула чарговай “адлігай” — беларускія мастакі адразу паспрабавалі нагадаць пра УНОВИС ды нават “ўваскрасіць Малевіча” (гэта быў легендарны перформанс Людмілы Русавай ды Ігара Кашкурэвіча). Аднак... як і амаль усё ў мастацкім жыцці Беларусі, падобныя пачыны мелі спарадычны характар. Адпаведна, вялікага выставачнага праекта, здатнага “зацэментаваць” нашы прэтэнзіі на ўдзел у фарміраванні сусветнай культуры, і сапраўды моцна бракавала.

У навуковым ды паўсядзённым ужытку паняцце “авангард” мае мноства розных значэнняў — часам нават палярных. Хтосьці называе ім канкрэтную мастацкую з’яву, якая мае пэўныя часавыя рамкі і таму з’яўляецца часткай гісторыі, а зусім не сучаснасці. Хтосьці, наадварот, лічыць авангардам усё тое, што падаецца яму “смелым ды незвычайным” — і, адпаведна, звышсучасным. Для кагосьці авангард — гэта Марынэці, Малевіч і Брэтон, якія ўсур’ёз спрабавалі змяніць чалавецтва, а для кагосьці — выкрунтасы мадэльераў на фестывалі “Мамант”. Падобна на тое, што куратар выстаўкі паспрабавала знайсці нейкае “сярэднеарыфметычнае” значэнне ўсіх гэтых размаітых трактовак.

— Услед за многімі даследчыкамі з розных краін, я не разглядаю авангард як нейкую лакальную культуралагічную з’яву, але перадусім як агульную характарыстыку тых мастацкіх працэсаў, што звычайна паўстаюць на зломе парадыгмы быцця, — кажа Наталля Шаранговіч. — І на беларускім прыкладзе мы гэта вельмі выразна бачым: УНОВИС шмат у чым звязаны з рэвалюцыяй, творчасць нонканфармістаў 1960-х — з хрушчоўскай “адлігай”, ну а пра плыні часоў “перабудовы” нават няма чаго казаць. Без сумневу, ментальныя і гістарычныя зломы моцна ўплываюць на мастацкі працэс. Змяняецца гістарычная парадыгма — змяняецца і мастацтва. Вось і тыя творы, якія мы ўбачым у экспазіцыі, наўрад ці маглі б з’явіцца, калі б іх аўтары не жылі ў незалежнай Рэспубліцы Беларусь.

На думку куратара, такая выстаўка можа зрабіць вялікі ўнёсак у іміджавую справу міжнароднага пазіцыянавання краіны. Бо давесці, што мы зусім не такія “замшэлыя”, як некаторым здаецца, з дапамогай слоў цяжка. А вось дэманстрацыя адметных узораў мастацкага мыслення спрыяе гэтай справе куды лепш.

■■■

Урэшце, куратар выстаўкі перакана, што ўжо такая ўнушальная колькасць аўтараў розных пакаленняў — ад жывых класікаў да ўчарашніх выпускнікоў — дазволіць усім цікаўным знайсці адказ на пытанне, куды ж рухаецца беларускае мастацтва, што з ім цяпер адбываецца. Паўторымся: у дадзеным выпадку адказ будзе даволі абгрунтаваны — зважаючы хаця б на беспрэцэдэнтную маштабнасць рэпрэзентацыі. Але пры гэтым, як падаецца, ён будзе ў кожнага свой. Куратарка наўмысна не парупілася пра тое, каб забяспечыць усіх ахвотных гатовай фармулёўкай...

Фота Юрыя ІВАНОВА

Наталля Барсукова, галерэя “Універсітэт культуры”, Мінск.

Мастачка Валянціна Шоба, Гродна.

Мастак Леанід Хобатаў са сталіцы.

Мастачка Антаніна Слабодчыкава, Мінск.

У час падрыхтоўкі экспазіцыі.

З калекцыі Віцебскага музея сучаснага мастацтва.

З калекцыі Віцебскага музея сучаснага мастацтва.

Работа А.Страшко “Random”.


Гродзенскі творца Яўген Адзіночанка.

Мастак Аляксандр Сільвановіч з Гродна.

Габелен Марыі Барысенка “Музыка вады”.

Фотамастак Валерый Вядрэнка са сваёй работай “Лошыца”.

Твор Аляксандра Салаўёва з Віцебска.


З калекцыі Віцебскага музея сучаснага мастацтва.

Калі 30 наведвальнікаў —

Кароткі змест папярэдняй “серыі”. У Культурную сталіцу Міншчыны, як часцяком на афіцыйным і неафіцыйным узроўнях называюць Маладзечна, я адправіўся пасля таго, як азнаёміўся “з першакрыніц” яшчэ ў сталіцы з асновамі эканомікі культуры Мінскай вобласці: даведаўся пра тое, колькі сродкаў з бюджэту было накіравана ў яе цягам 2013 года, якія спосабы падсілкавання шукаліся для культурнай дзялянкі з дапамогай пазабюджэтнага фінансавання. І вось цяпер — чарга Маладзечна.

Алег КЛІМАЎ,
Мінск — Маладзечна — Мінск

Не дыскатэкі, а канцэрты

...П’ючы зялёную гарбату, прапанаваную начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Маладзечанскага райвыканкама Аляксандрам РАМАНОВІЧАМ, я ні на хвіліну не забываўся на тое, дзеля чаго, уласна, дамагаўся яго аўдыенцыі. Гутарылі мы, прызнацца, пра многае, у тым ліку і пра рэчы, якія наўпрост не мелі дачынення да прадмета, абумоўленага рэдакцыйным заданнем. Размова была доўгай і, лічу, прадуктыўнай, аднак абмяжуюся трыма пытаннямі і трыма адказамі з яе.

— На якім “фронце” платных паслуг для насельніцтва ваш край атрымаў найбольшы поспех?

— Калі казаць пра Маладзечанскі раён наогул, дык да 2013 года асноўныя пазабюджэтныя паступленні ў вёсцы давалі нам дыскатэкі, летась жа мы зрабілі ўпор на платныя канцэрты. Справа ў тым, што вячэрнія дыскатэкі (з 20 да 24 гадзін) абыходзіліся нам дорага ў плане фінансавых страт. Сітуацыя вядомая любому начальніку аддзела: калі праваахоўнымі органамі на такіх мерапрыемствах затрымліваліся дзяўчаты ды юнакі, якія праз свой узрост не мелі права знаходзіцца на танцавальных вечарах пасля пэўнага часу, то ўстановы культуры былі вымушаны плаціць штрафы, а іх набралася на 13 мільёнаў рублёў. І тады мы пайшлі на кардынальныя меры (нягледзячы на магчымую незадаволенасць людзей): пакінулі толькі падлеткавыя дыскатэкі, самыя познія з якіх заканчваюцца да 22-й гадзіны. Узамен прапанавалі на пастаяннай аснове канцэрты беларускіх артыстаў — і так выйшла, што скаргаў ад наведвальнікаў дыскатэк было няшмат, а на выступленне выканаўцаў публіка хадзіла актыўна. Але тут ужо ўзнікла наступная тонкасць: калі грошы ад дыскатэк усе былі нашы, то з канцэртаў пэўную суму мы абавязаны выплаціць артыстам. Гэта значыць, як сказалі б раней, “план па вале” выканалі, але грошай недаатрымалі. Ламаем цяпер над гэтай праблемай галаву...

— Кажуць, з “праславутай” аптымізацыяй вы апярэдзілі на Беларусі ўсіх...

— Цалкам верагодна, што мы сталі першапраходцамі ў гэтым аспекце. Напрыклад, у Лебедзеве ўжо некалькі гадоў таму ўстановы культуры сабралі ў адзін культурны цэнтр, а вызваленыя будынкі альбо адышлі прадпрыемствам, альбо былі выстаўлены на аўкцыён. У Аляхновічах пайшлі падобным шляхам. Уціскацца нам, вядома, трэба. У раёне сёння — 74 установы культуры, дзе занята больш чым 800 работнікаў. Шмат, трэба “рэзаць”. Як? Дапусцім, бібліятэкі, рэйд па якіх мы нядаўна здзейснілі. У адзін дзень у адной з іх 50 наведвальнікаў, у іншы — 30, часцей — апошняя лічба. А абслугоўваюць іх чатыры чалавекі. Дык ці мэтазгодна тое? У пытанні аптымізацыі неабходны кропкавы падыход і, калі трыццаць наведвальнікаў — гэта тэндэнцыя, то, значыць, будзем бібліятэкараў скарачаць...

— На ваш погляд, ці варта нешта скарэктаваць у культурнай сферы на ўзроўні заканадаўства?

— Патрабуе, лічу, грунтоўнай рэвізіі Закон “Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь”, многія палажэнні якога альбо састарэлі, альбо ўвогуле не адпавядаюць сённяшняму дню. Даходзіць да таго, што, да прыкладу, адна і тая ж структура ў нашай сферы можа называцца ў розных месцах па-рознаму: “цэнтралізаваная клубная сістэма” або “цэнтральны аддзел клубаў”. Усё гэта і спараджае непатрэбную бюракратыю. Варта навесці парадак у штатным раскладзе. І я больш правоў дэлегаваў бы ўстановам культуры менавіта на месцах — у юрыдычных, фінансавых пытаннях...

Раскладка па музеі

Ад райвыканкама да Мінскага абласнога краязнаўчага музея (не забываем, размешчанага ў Маладзечне) — рукой дацягнуцца. Падыходжу. Акуратнае, моцнае, як кажуць, збудаванне — ніводнай плямкі звонку, быццам толькі ўчора пасля суботніка. Усярэдзіне — такая ж строгасць, вытанчанасць і чысціня. Раблю камплімент дырэктару Таісіі Лянкевіч, маўляў, адразу відаць стаўленне людзей да свайго другога дому. Яна дзякуе, усміхаецца. А дзяржава ў 2013 годзе выказала сваё стаўленне да музея, у тым ліку і праз бюджэт, на суму больш як 2 мільярды 631 мільён рублёў.

Мяркую, артыкулы выдаткаў будуць цікавыя і для калег Таісіі Лянкевіч ды яе супрацоўнікаў. Дык вось, 840 мільёнаў з названага аб’ёму вылучылі на набыццё слуцкага пояса, у 70 мільёнаў абышліся карціны мясцовых мастакоў — графічныя і жывапісныя. Для выстаўкі “Прырода Міншчыны” набыты чучалы жывёл (рысь, да прыкладу, каштавала 13 мільёнаў); для будучай экспазіцыі пра XX стагоддзе закупілі друкарскую машынку “Ундэрвуд” пачатку мінулага стагоддзя, швейную машынку “Зінгер”, прадукцыю Мінскага фарфоравага завода, нагрудныя знакі. Нарэшце, для патрэб установы быў набыты камп’ютар.

“Нам перадалі ўжо будынак колішняга архіва, — дзеліцца звесткамі Таісія Леанідаўна. — Там будзе праведзены капітальны рамонт і размесціцца фондасховішча музея. Але гэта планы яшчэ нават не заўтрашняга дня”.

Сярэдняя заработная плата тутэйшых музейных работнікаў на канец мінулага года (у штаце — 27 чалавек) складала каля 2,5 мільёна рублёў. Амаль 18 мільёнаў супрацоўнікі ўстановы зарабілі праз пазабюджэт, выканаўшы адпаведны план на 140%. Акрамя білетаў, бліжэйшым часам праз касу можна будзе купіць розныя сувеніры, а на рэалізацыю музей, хутчэй за ўсё, стане браць прадукцыю рамеснікаў.

І яшчэ. Таісія Лянкевіч кажа, што ўстанова рыхтуецца да Другога Нацыянальнага форуму “Музеі Беларусі”, які пройдзе ўвосень у Гомелі.

Ідзіце ў тэатр і...

З дырэктарам Абласнога драматычнага тэатра Юрыем Крывенькім мы сустрэліся па завяршэнні ранішняга дзіцячага спектакля. Юныя гледачы ажыўлена абмяркоўвалі ля ўвахода перыпетыі толькі што ўбачанага і жмурыліся ад сонца...

У тэатры з залай на 150 месцаў працуюць 84 чалавекі, акцёрскі склад — 22 адзінкі (21 артыст — у штаце, адзін — запрошаны). У сезон трупа дае 380 спектакляў (з цяперашняга красавіка іх у рэпертуары 36, 10 з якіх — дзіцячыя; 80 працэн-

Няпростыя візаві...

У трох апытаных вядомых асоб, якія нарадзіліся ў Маладзечне, — сваё стаўленне да горада. Яны, прызнацца, здзівіліся нашай прапанове (зірнуць на тамтэйшую культуру з каляэканамічнага гледзішча), ды ў просьбе не адмовілі...

Валерыя АРЛАНАВА, кінаактрыса, артыстка Тэатра-студыі кінаакцёра Нацыянальнай кінастудыі “Беларусьфільм”:

— У Маладзечне бываю толькі наведваючы маму. А навіны пра горад паведамляе сястра, якая жыве там. Яна кажа, што з культурай у горадзе ўсё ў парадку. Праўда, не так даўно сястра была на нейкай музейнай выстаўцы, якая ёй не спадабалася. Напэўна, таму і людзей туды прыйшло мала...

Ніна БАГДАНАВА, спявачка, тэлевядучая:

— Шмат папаездзіўшы па краіне, заяўляю з упэўненасцю: у Маладзечне беражліва ставяцца да ўсяго таго, што звязана з культурай. Я не хачу сказаць, нібыта ў іншых населеных пунктах з ёй усё неяк не так! Але ж Маладзечна — мой родны горад, магу ж я быць трошачкі прадузятай?!. Як артыстку мяне задавальняюць канцэртныя пляцоўкі. Надзвычайны Палац культуры, Летні амфітэатр, які калі ў чым і саступае віцебскаму, дык толькі ў колькасці пасадачных месцаў: камфортны, зручны, з выдатнай акустыкай і класнай гукавой апаратурай. Дакладна ведаю, што нашы ды замежныя выканаўцы з задавальненнем выступаюць і ў Палацы, і ў амфітэатры!..

Мікалай КІРЫЧЭНКА, народны артыст Беларусі, акцёр Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы:

— Так выйшла, што ў Маладзечне я не быў даўно. Запрашалі неяк на Дзень горада, але паездка па пэўных прычынах сарвалася. Аднак магу сказаць, што Маладзечна нездарма называлі і называюць Культурнай сталіцай Міншчыны. Ён і сам па сабе прыгожы, вечна малады, нягледзячы на шматвяковую гісторыю, і яго ўстановы культуры заўсёды цешылі вока...

Беларусы замежжа

“Кліч” як новая фармацыя

У Бюро міжэтнічных зносін Рэспублікі Малдова, што ў Кішынёве, прайшла ўстаноўчая канферэнцыя грамадскага аб’яднання “Беларускі культурны рух Рэспублікі Малдова “Кліч”. Ініцыятарам яго стварэння стала ўраджэнка Мінска Ганна Мазур — культуролаг, выпускніца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, фотамастачка.

У канферэнцыі прынялі ўдзел Часовы Павераны ў справах Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Малдова Аляксандр Салаўёў, старшыня Беларускай грамады Юрый Статкевіч, старшыня Асацыяцыі беларусаў муніцыпія Кішынёў “Беларусь” Генадзь Зяньковіч, беларускі мастак Вячаслаў Ігнаценка, народная артыстка Рэспублікі Малдова і сябра беларускай дыяспары ў Малдове Маргарэта Івануш.

Наогул, паводле перапісу насельніцтва за 2004 год, у Рэспубліцы Малдова пражывае каля 6 000 этнічных беларусаў. Інфраструктура беларускай дыяспары прадстаўлена тут восьмю грамадскімі арганізацыямі. Адна з іх — “Беларуская грамада ў Рэспубліцы Малдова” (Кішынёў) носіць статус рэспубліканскага грамадскага аб’яднання беларускай дыяспары Рэспублікі Малдова.

За перыяд існавання больш за паўтысячы гадоў на малдоўскай зямлі беларускі этнас пакінуў на ёй велізарны пласт карыснага і канструктыўнага. Аднак, адзначае Ганна Мазур, трывожыць тое, што працэс адаптацыі беларусаў, асабліва другога і трэцяга пакаленняў, у мясцовы культурны асяродак адбываецца ў форме асіміляцыі. Спадарыня Мазур падкрэсліла: “Амаль цалкам адсутнічае беларускамоўны асяродак — галоўны фактар захавання беларускай нацыі ў Малдове. Сёння для прадстаўніка беларускага этнасу амаль немагчыма пачуць у Малдове беларускую мову, а тым больш — пагутарыць на ёй. Магу канстатаваць, што ў Рэспубліцы Малдова няма ніводнай адукацыйнай установы, дзе можна якасна вывучаць беларускую мову”.

У сувязі з гэтым “Кліч” — новая фармацыя беларускай дыяспары. Гэта этнакультурны фармат для ўсіх тых, хто адносіць сябе да беларускага этнасу альбо праяўляе цікавасць да беларускай культуры.

Асноўнымі мэтамі Руху з’яўляюцца: захаванне, вывучэнне, развіццё і папулярызацыя беларускай культуры, мовы, гісторыі, традыцый, звычаяў; сімбіёз культур; спрыянне ўмацаванню двухбаковых сяброўскіх адносін; садзеянне развіццю інфраструктуры беларускай дыяспары і ўзаемадзеянню яе суб’ектаў для захавання фактару беларускай прысутнасці ў свеце на карысць беларускага народа; захаванне беларускай дыяспары ў Малдове, развіццё сацыяльных інстытутаў дыяспары...

Аляксандр Салаўёў паабяцаў новай фармацыі комплексную дапамогу і падтрымку з боку дыпструктур Беларусі ў Малдове. Па словах Юрыя Статкевіча, Беларуская грамада ў Малдове выдатна ўсведамляе прыярытэтнасць мэт беларускай дыяспары, а пашырэнне інфраструктуры — гэта бясспрэчны прыярытэт, які ўзмацняе фактар культурнай і інфармацыйнай прысутнасці ў іншай краіне. Асацыяцыя беларусаў муніцыпія Кішынёў “Беларусь” цёпла адгукнулася на ініцыятыву стварэння новай арганізацыі. Быў зацверджаны яго Статут і выбрана Праўленне Руху, якое ўзначаліла Ганна Мазур.

Пасля афіцыйнай часткі канферэнцыі паказалі беларускамоўны інтэрактыўны спектакль пад назвай “Вясновы Кліч” (паводле абраду “Гуканне вясны”). Ён падрыхтаваны дзецьмі і моладдзю беларускага, малдаўскага, рускага, украінскага і румынскага паходжання.

На людным месцы

На выстаўцы, што адкрылася ў Доме-музеі Элізы Ажэшка, — вялікая колькасць велікодных падарункаў: яйкі і лялькі, баваўняныя вырабы, лыжкі і паштоўкі... Іх збіралі па Гродне і па раёне ад народных майстроў. Прадстаўлены і работы дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі з Гродзенскага дзіцячага хоспіса.

ГРОДНА

Ад дзетак і майстроў

Кіраўнік апошняга Вольга Шульга кажа:

— На выстаўцы выхаванцы сумесна з валанцёрамі і бацькамі дзетак прадстаўляюць свае работы да Вялікадня. Гэта робіцца ў рамках дабрачыннага праекта “Цуд велікодны”, які мы ладзім чацвёрты год запар, каб паказаць тыя таленты і магчымасці, што маюць дзеці з інваліднасцю. Таксама хацелася б прыцягнуць увагу да сем’яў, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю, і тут можна ўбачыць розныя творы іх аўтарства: работы з бісеру, дрэва, бутэлькі, дэкараваныя ў тэхніцы дэкупаж, лялькі ў беларускіх строях...

На адкрыццё выстаўкі завіталі святары са Свята-Пакроўскага сабора ды Гродзенскай каталіцкай вышэйшай духоўнай семінарыі, каб распавесці прысутным пра традыцыі адзначэння Вялікадня.

Ксёндз Віталь Сідорка, выкладчык Гродзенскай духоўнай семінарыі, кажа, што яго найбольш уразіла выстаўка работ дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі:

— Можа, гэтыя дзеткі і маюць нейкія цялесныя абмежаванні, але дух жа нельга абмежаваць. Па выстаўцы ў музеі добра бачна, што радасць, прыгажосць і святло Вялікадня яны таксама па-свойму ўсведамляюць: радуюцца, перажываюць, бо іхнія душы — сапраўды светлыя. Ісус выразна сказаў у сваім Евангеллі: “Калі не станеце як дзеці — не ўвойдзеце ў Божае Царства”. І, можа, нам, дарослым, часам варта браць прыклад з гэтых дзяцей...

Андрэй МЯЛЕШКА
Гродна
Фота аўтара

Ля Мінскага абласнога краязнаўчага музея.

На рэпетыцыі спектакля "ОбломOFF" у Мінскім абласным драматычным тэатры: Дзяніс Фешчанка, Андрыян Барткевіч і Аляксей Карпец.

У Маладзечне — пра дыскатэкі з праблемамі, канкурэнцыю і цякучку кадраў

установу трэба "рэзаць"

Аляксандр Рамановіч.

Таісія Лянкевіч. / Фота на паласе — Юрыя ІВАНОВА

таў пастановак — на беларускай мове). У мінулым годзе тэатрам было "выпушчана" 4 новыя спектаклі (па 2 дзіцячых і дарослых). Кошты на білеты: дзіцячыя — 18-20 тысяч рублёў, дарослыя — 35-40 тысяч.

З бюджэту-2013 тэатр атрымаў 3 мільярды 160 мільёнаў рублёў, якія былі патрачаны, у асноўным, на новыя пастаноўкі ды гастрольную дзейнасць. Сваімі сіламі, на спектаклях, паказаных у горадзе і на выездзе, маладзечанцы зарабілі 450 мільёнаў рублёў.

— З запаўняльнасцю, — не хавае заклапочанасці Юрый Паўлавіч, — апошнім годам з'явіліся праблемы. Расце канкурэнцыя з боку устаноў, якія прапануюць публіцы замежнае масавае мастацтва — у першую чаргу расійскае, антрэпрызы. Тэатралы не зніклі раптам, але сёння яны, стамляючыся ад навакольных рэалій, усё часцей выбіраюць у якасці рэлакс-сродкаў шырспажыў, каб проста "праветрыць мазгі". На кожным нашым мастацкім савеце абмяркоўваем, чым жа мы можам завабіць публіку. Раней яна ішла яшчэ і на прыезджыя беларускія тэатры, на так званую абменку (гэта калі калектыў, напрыклад, з Віцебска едзе ў Маладзечна, а мы, адпаведна, — у Віцебск). Цяпер такога ўзаемаабмену стала менш: усё ўпіраецца ў недахоп сродкаў. Аплата праезду, пражыванне ў гасцініцы, камандзіровачныя — гэтыя выдаткі сур'ёзна б'юць па кішэні тэатра. Таму скарацілася і частата гастролей, і колькасць артыстаў, якія выязджаюць на іх. Тыповая гастроль цяпер выглядае так: адпраўляецца трупа раніцай, дае ранішні, дзённы спектаклі, адзін вячэрні і — вяртаецца назад. Эканомія грошай? Так. Але такі сціснуты рэжым адбіваецца на акцёрах, прыводзіць да стрэсаў, што, вядома ж, прафесіі ў плюс не ідзе.

А самы-самы галаўны боль для дырэктара — кадры. Сярэдняя заработная плата ў тэатры складае 2 мільёны 720 тысяч рублёў, канкрэтна ў акцёраў — 2 мільёны 860 тысяч рублёў. Маладыя спецыялісты, якія прыйшлі па заканчэнні профільных устаноў, атрымліваюць 1 мільён 600 тысяч рублёў, і таму тут не затрымліваюцца. "Асветніцтва патрабуе грошай, — іранічна уздыхае Юрый Паўлавіч і не без сарказму дадае: — Але як ставілі мы спектаклі, так і будзем ставіць. Шукаем спосабы для прыцягнення фінансаў ды для іх эканоміі. Ёсць магчымасць нешта зрабіць таннейшым — зробім. Але нельга ўсё рабіць танна да бясконцасці. Можам даэканоміцца да таго, што адукоўваць людзей стануць аўтары нізкапробных п'ес (і гэта ўжо ў маштабах не толькі нашай краіны адбываецца!), а не Крапіва з Купалам..."

І яшчэ Юрый Крывенькі нястомна думае над тым, як захаваць акцёрскі касяк — гонар і гісторыю тэатра, артыстаў, якія аддалі мастацтву шмат гадоў, а на іншы прыробак сіл фізічных ужо не засталося. І ставіць дырэктар пытанне перад вышэйшымі інстанцыямі, каб у рамках бюджэту ён мог распараджацца апошнім у плане рэгулявання хаця б даплат. Іншая ідэя заключаецца ў тым, каб падзяліць трупу на дзве часткі: адна будзе занята ў рэпертуарных спектаклях у горадзе, другая — гастраляваць, у тым ліку з антрэпрызамі, разлічанымі на масавага гледача пастаноўкамі, якія прыносяць "жывыя" грошы...

Не спаць!

Ну вось і завяршылася падарожжа эканамічнага дылетанта па абласных цэнтрах Беларусі. Некаторым агульным высновам і, па магчымасці, аналітыцы, звязаным з эканомікай культуры ў прапанаваным вам разрэзе, плануецца прысвяціць адзін з будучых матэрыялаў.

Акунуўшыся ж на некалькі гадзін у сферу культуры Маладзечна як абласнога горада, не скажу, што выявіў там нейкія уласцівыя толькі гэтым мясцінам праблемы і дасягненні, прыгадваючы свае камандзіроўкі ў Віцебск, Брэст, Магілёў, Гродна ці Гомель. Усюды, з разуменнем ставячыся да не самых лепшых часоў у эканоміцы, дзякуюць дзяржаве за тое, што яна, зыходзячы з магчымасцей, вылучае сродкі з бюджэту, якія трацяцца з розумам, на самае першачарговае, на самае неабходнае ў дадзены момант. Усюды, як могуць, — з фантазіяй або рухаючыся накатанай дарогай, адшукваюць дадатковыя грошы на сваё існаванне. І ўсюды з трапятаннем ставяцца да слова "аптымізацыя". Канкрэтна па Маладзечанскім раёне мяне крыху насцярожыла "барацьба з дыскатэкамі", хаця Аляксандр Рамановіч і не хавае, што меры, прынятыя ў дачыненні да іх, — хутчэй за ўсё, часовыя, і пытанне кантролю ўзросту наведвальнікаў "танцпляцовак для моладзі", зразумела, трэба вырашыць больш цывілізаваным спосабам.

К

Крыху статыстыкі

З бюджэту ўстановам культуры Маладзечанскага раёна ў 2013 годзе было выдзелена 44,5 мільярда рублёў. З іх у Маладзечна: для Палаца культуры — 8,4 мільярда рублёў, Дзіцячай школы мастацтваў — 5,9 мільярда рублёў. Пазабюджэтныя даходы раёна — 4 мільярды 775 мільёнаў 500 тысяч рублёў, або 159,6 працэнта ад 2012 года. Напрыклад, Мінскі абласны тэатр лялек "Батлейка" зарабіў такім чынам каля 300 мільёнаў рублёў.

На людным месцы

Любая вялікая рака свой пачатак бярэ з маленькай крынічкі. Мае свае вытокі і ўзорны баянны аркестр Маларыцкай дзяржаўнай дзіцячай школы мастацтваў.

МАЛАРЫТА

Аркестр і яго вытокі

Ён вядзе адлік свайго творчага часу з 1989 года. Менавіта тады Валянціна Калоша, таленавіты педагог, чалавек ініцыятыўны і мэтанакіраваны, арганізавала спачатку ансамбль баяністаў і акардэаністаў, а потым — і аркестр. У ім іграла не такая вялікая колькасць чалавек, як цяпер, ды і рэпертуар быў не вельмі разнастайны. Валянціна Раманаўна кіравала аркестрам больш за два дзясяткі гадоў. Паступова дзіцячы баянны калектыў станавіўся вядомым і запатрабаваным не толькі на Маларытчыне, але і ў вобласці. У 1999-м калектыву баяністаў за высокае выканальніцкае майстэрства і актыўнае творчае жыццё было прысвоена званне "ўзорны".

З 2010-га аркестр узначальвае Наталля Яромчанка. Калектыў не спыніўся ў сваім развіцці. З прыходам новага кіраўніка баянны аркестр працягвае традыцыі, закладзеныя Валянцінай Калоша. Сёння калектыў складаецца з 27 чалавек.

— Стварыць дзіцячы аркестр у музычнай школе, ды яшчэ — з добрай канцэртнай праграмай, адпаведным узроўнем выканальніцкага майстэрства, — кажа Наталля Яромчанка, — справа вельмі складаная. Кожны год у калектыве часткова абнаўляецца склад. Дзеці заканчваюць навучанне і пакідаюць сцены школы, ім на змену прыходзяць іншыя. Усё пачынаецца спачатку. Некаторыя з выпускнікоў-удзельнікаў баяннага аркестра ўжо набылі, а іншыя яшчэ атрымліваюць адукацыю ў спецыяльных музычных навучальных установах. Саліст аркестра Пётр Манько стаў стыпендыятам спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі.

— Іграць у аркестры для мяне вельмі прэстыжна і ганарова, — гаворыць удзельнік калектыву Максім Паўлаў. — Каб устойліва "трымацца" на дасягнутым узроўні, які цяпер мае аркестр, мы шмат працуем...

Мікалай НАВУМЧЫК
Маларыта

Ода... падушцы

Клуб кветкаводаў "Флора" Салігорскай раённай цэнтральнай бібліятэкі адкрыў чарговую выстаўку і назваў яе "Жыццё ў падушках". Разам з творчай групай "Жывая тканіна" мясцовай гімназіі № 3, пад кіраўніцтвам мастака і кветкавода Алены Дамарад "фларавікі" не толькі аформілі выстаўку аўтарскіх падушак, распісаных у тэхніцы батык, але і падрыхтавалі прэзентацыю.

САЛІГОРСК

Працаваць давялося з дзецьмі. Мусілі ўлічваць, што сучасныя падлеткі могуць сканцэнтраваць сваю ўвагу ўсяго толькі хвіліны на чатыры, таму выкарыстоўвалі метад "пераключэння каналаў" успрыняцця: "Паслухайце, а цяпер паглядзіце. А цяпер памацайце ці нават панюхайце. А цяпер ізноў паслухайце". Так будавалася работа з будучымі чытачамі "дарослай" бібліятэкі.

Цяжка пералічыць усіх удзельнікаў і памагатых: бібліятэкары, бацькі, педагогі, кветкаводы, чытачы... Словам, гэта была калектыўная акцыя дабрыні, прысвечаная падушцы, што дае салодкі сон, ратуе ад хвароб, хавае пад сабой доўгачаканы падарунак...

Мы "ажывілі" назву выстаўкі. Мастачкі-гімназісткі сталі на пэўны час артысткамі, манекеншчыцамі. Дэфіле піжам адбылося дзякуючы дапамозе гендырэктара па ідэалогіі ААТ "Купалінка" Ілоны Гражынскай. Яна вельмі хвалявалася, ці спадабаецца іхняя прадукцыя маленькім модніцам. І гэта менавіта яна прэзентавала падарункі ад "Купалінкі" ўсім удзельнікам выстаўкі.

Сон-арт — новы кірунак (не шукайце ў слоўніках: мы самі яго прыдумалі). Прысутныя старанна распісалі ўручную падушку. А экскурсію па выстаўцы правяла Зінаіда Рамановіч, якая распавяла пра гісторыю падушкі... Вось і атрымалася, што ў маленькіх артыстаў і мастакоў творчы дэбют адбыўся менавіта ў бібліятэцы. Успаміны пра гэта застануцца на ўсё жыццё. І мы спадзяёмся, што бібліятэка, у якой не заўжды бывае ціха, стане для будучых чытачоў роднай.

Кацярына ВАВІЛАВА,
бібліятэкар першай катэгорыі Салігорскай РЦБ, кіраўнік клуба кветкаводаў "Флора"

Дзень аховы помнікаў і памятных мясцін у рэдакцыі прынята адзначаць суботнікамі на тых адметнасцях, што найперш і патрабуюць гэтай самай аховы — ці, прынамсі, клопату неабыякавых людзей. Вось і сёлета калектыў газеты "Культура" зноў вырашыў узяць удзел у талацэ на тэрыторыі колішняй сядзібы Рэйтанаў у вёсцы Грушаўка Ляхавіцкага раёна. Сустрэўшыся папярэдне з яе арганізатарам Зміцерам Юркевічам, абмеркавалі розныя практычныя пытанні: прыкладам, дзе ўзяць бензапілу, каб хутка спілаваць дрэвы, якія паспелі вырасці непасрэдна ўнутры напаўзруйнаванага бровара. Агулам запланаваныя работы, вядома ж, былі вельмі сціплыя: прыбраць лісце, што назапасілася за восень, а таксама і смецце, якое таксама назапашваецца ў сядзібе...

Кастусь АНТАНОВІЧ, Ілья СВІРЫН

Пра суботнік, які мог... не адбыцца

Ад "Грушаўкі" да Грушаўкі-2

...Бензапілу мы так і не знайшлі, але, як высветлілася, яна нам і не спатрэбілася. Затое да нашай грамады ахвотна далучылася знакамітасць. Адзін з супрацоўнікаў рэдакцыі выпадкова сустрэўся ў метро з "дылетантам" Юрыем Жыгамонтам, і, даведаўшыся пра суботнік у такім легендарным месцы, як Грушаўка, тэлезорка адразу папрасіла зарэзерваваць для яе месца ў машыне. Да суботніка далучыўся і дырэктар мастацкай школы ў Баранавічах Анатоль Лабкоўскі, а таксама іншыя творчыя асобы. Прыемна адзначыць, што грамада, якая апякуецца Грушаўкай, паступова расце.

Паводле ўсталяванай летась традыцыі, стартавалі мы з мінскай Грушаўкі і роўна апоўдні былі на месцы. Убачанае ў сядзібе нас, па шчырасці, моцна здзівіла: дзясяткі аўтамабіляў, вялікі натоўп людзей з працоўным варштатам, клубы дыму ад спаленай сухой лістоты, нават аўтакрама... Карацей, працаўнікоў аказалася значна больш, чым мы разлічвалі, і ўвесь запланаваны аб'ём работ да нашага прыбыцця ўжо быў збольшага выкананы. Таму на гэтым сапраўдным свяце працы мы пачуваліся нейкімі... лішнімі. Нам так і казалі: "Ну вы ж турысты, дык і адпачывайце сабе спакойна. Даруйце, калі перашкодзім ровам сваіх бензапіл!"

Іншых варыянтаў, апрача продажу сядзібы ў прыватныя рукі, мясцовыя ўлады не бачаць. Але ж удумлівая пазіцыя кіраўніка раёна, які імкнецца не проста пазбавіцца "дрэннага актыву" (гэта значыць, абы прадаць), а знайсці сапраўды сур'ёзнага, стратэгічнага інвестара, без сумневу, вартая павагі.

Як высветлілася, новы старшыня Ляхавіцкага райвыканкама Вячаслаў Сельмановіч вырашыў узяцца за праблемную сядзібу ўсур'ёз. У раёне яна стала асноўным аб'ектам сёлетняга Рэспубліканскага суботніка. Па словах начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Ніны Прыхач, цягам двух тыдняў у Грушаўцы адпрацавалі прадстаўнікі ці не ўсіх арганізацый раёна — агулам чалавек 300. Прыбралі смецце, абрэзалі дрэвы, добраўпарадкавалі парк і капліцу, пазабівалі дошкамі ўсе аконныя і дзвярныя праёмы ў аварыйным будынку стайні, у палацы аднавілі пашкоджаную кансервацыю, каб абараніць іх ад няпрошаных гасцей... І сабралі вялізныя купы гнілой лістоты, дым ад якой і спалохаў нас пры ўездзе ў сядзібу.

Больш за тое: сабраныя ў выніку суботніка сродкі (больш за 140 мільёнаў рублёў) пойдуць на выраб прававызначальнай дакументацыі на будынкі маёнтка. Як мы ўжо не раз пісалі, менавіта яе адсутнасць з'яўляецца моцнай перашкодай для вызначэння "новага лёсу" Грушаўкі.

— Людзі, якія не шануюць сваю гісторыю, не маюць будучыні, — мяркуе Вячаслаў Сельмановіч. — Так, мае папярэднікі надавалі больш увагі іншым аб'ектам, вось і райцэнтр давялі да ладу, рыхтуючыся да леташніх абласных "Дажынак". Але з часам і да Грушаўкі рукі дайшлі. Гэта ж сапраўдны наш скарб! Тут можна праводзіць разнастайныя фестывалі, святы, тое ж Купалле. Ладзіць, як раней казалі, культурны адпачынак для нашай моладзі...

Натуральна, у гутарцы была закранута і будучыня гэтых мясцін: сёння сядзіба, лічы, безгаспадарная... Раённае кіраўніцтва вырашыла абраць звычайны для такіх выпадкаў алгарытм: прадаць гэты аб'ект прыватніку. Балазе ўжо і "купец", нібыта, з'яўляўся на далягляддзе...

— Вядома, прадаваць будзем з пэўнымі ўмовамі, — тут жа дадаў Вячаслаў Лукіч. — І галоўная з іх — каб гістарычны складнік быў напоўніцу захаваны. Перарабляць тут усё на свой капыл не дазволім: надта шмат гэтыя мясціны значаць для нашага краю. А калі з'явіцца турыстычны аб'ект, прывабны і для гасцей, і для нас саміх... Тут мы абедзвюма рукамі "за"!

Іншых варыянтаў, апрача продажу сядзібы ў прыватныя рукі, мясцовыя ўлады не бачаць. Яно і зразумела: каб адрадзіць вялізны ансамбль, патрэбны не адзін мільён долараў укладанняў. Лішне нават казаць, што ў раёна такіх грошай няма. Але ж удумлівая пазіцыя яго кіраўніка, які імкнецца не проста пазбавіцца "дрэннага актыву" (гэта значыць, абы прадаць), а знайсці сапраўды сур'ёзнага, стратэгічнага інвестара, без сумневу, вартая павагі.

Пры змене ўласніка асаблівай увагі вымагае той невялічкі і нягеглы на выгляд будынак, пашчэрбленыя муры якога памятаюць Тадэвуша Рэйтана — адзіныя з усяго вялізнага сядзібнага комплексу. Бо калі, скажам, руіны стайні пачатку XX стагоддзя пасля рэстаўрацыі могуць быць прыстасаваны пад што заўгодна — уключна... са стайняй, — дык наконт новай функцыі "Мураванкі" сумневаў узнікаць не павінна. Тут мае быць музей і толькі музей!

...Урэшце, працу сабе мы, вядома, знайшлі! Па ініцыятыве Зміцера Юркевіча, ля ўезда ў сядзібу быў усталяваны новы інфармацыйны шчыт, які распавядае пра яе гісторыю — ад часоў першай вядомай нам уласніцы Барбары Радзівіл. А таксама мы прачысцілі ад хмызоў ліставую алею, што вядзе да капліцы, знакамітую "лесвіцу ў неба".



А мастак Алесь Родзін тым часам развешваў на фасадзе палаца сваю серыю твораў, прысвечаных Рэйтанам. Паводле яго слоў — прымерваўся перад іх вернісажам, што запланаваны ўлетку ў рамках фестывалю "Дах" у Грушаўцы.

Таму засмучацца з той нагоды, што нам не хапіла працы, не выпадала. Наадварот, той імпэт, з якім жыхары Ляхавіччыны ўзяліся за справу, гледзячы на ўласны прыклад старшыні мясцовага сельсавета Вячаслава Новіка, прымусіўшы нас пачувацца турыстамі, здзівіў. Безумоўна, так яно і павінна быць: ніякія "вылазкі" энтузіястаў не здолеюць вырашыць усе праблемы помнікаў у выпадку інертнасці ды абыякавасці мясцовых жыхароў...

Фота Кастуся АНТАНОВІЧА

Вынікі шоукейса ў Эстоніі для нашага рынку

Увесну ў эстонскай сталіцы ў шосты раз прайшоў Музычны шоукейс-фестываль "Tallinn Music Week" з удзелам больш чым дзвюх соцень выканаўцаў з 27 краін свету. Не ўсім яшчэ знаёмае слова "шоукейс" азначае, што прадстаўленыя на мерапрыемстве артысты ў сваёй аснове — не занадта знакамітыя або зусім невядомыя ў глабальнай індустрыі забаў, і прыехалі яны дэманстраваць сваё майстэрства на яго, па большай частцы, за ўласны кошт і, адпаведна, не атрымліваючы ганарар.

Алег КЛІМАЎ

Мэйнстрым не пройдзе, таму што...

У рамках форуму, які доўжыўся тры дні, на трыццаці пляцоўках старажытнага горада адбылося мноства канцэртаў рок-, поп-, індзі-, індзі-поп-, этна-, рэп-, альтэрнатыўнай, электроннай і класічнай музыкі. Акрамя выступленняў, прайшлі канферэнцыя па музычным рынку і некалькі панэлей-дыскусій, прысвечаных праблемам арганізацыі фестываляў, функцыянаванню незалежных лэйблаў, прасоўванню артыстаў, выкарыстанню музыкі ў рэкламе, а таксама перспектывам стварэння адзінага музычнага рынку для дзяржаў Балтыі. "Фішкай" жа "Tallinn Music Week" стаў сеанс хуткіх сустрэч: на размову адводзілася пяць хвілін, калі можна было пагутарыць з супрацоўнікамі кампаній, якія займаюцца менеджментам выканаўцаў, кіраўнікамі фестываляў і лэйблаў.

Беларусь на форуме была прадстаўлена папулярным музычным інтэрнэт-парталам, на чале якога стаіць вядомы журналіст, піяр-менеджар і прадзюсар Дзмітрый БЕЗКАРАВАЙНЫ. З ім мы і пагутарылі пра фэст.

— Вазьму на сябе смеласць сказаць ад імя беларускага меламана: гледзячы на "спісачны склад" удзельнікаў фестывалю, можна прасякнуцца сумневамі наконт значнасці форуму... Дзе ж зорныя артысты?..

— А фэст і не арыентаваны на мегазорак. Навошта на яго едуць? Прамоўтары і незалежныя лэйблы — у пошуках талентаў, каб паглядзець на нераскручаных або вядомых пэўнаму колу спецыялістаў выканаўцаў, узяць кагосьці з іх на заметку, нешта сяму-таму прапанаваць. Артысты — каб наладзіць кантакты з прадстаўнікамі індустрыі, прадэманстраваць сваё мастацтва. Асабістыя ж зносіны, жывое ўспрыманне ў гэтым сэнсе больш выйгрышнае, чым перапіска па электроннай пошце, відэаканферэнцыі ды праслухоўванне трэкаў у Інтэрнэце. Што да брэндаў, то яны былі: буйныя кампаніі, арганізацыі, якія працуюць у сваім сегменце музыкі. Гэта фестывалі з Іспаніі, Фінляндыі, Латвіі, Расіі, лэйблы з ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі. Адпаведна, гэты адзін з галоўных шоукейс-фестываляў у Еўропе можа стаць кропкай адліку, даць шанц у прасоўванні творчасці, бо, урэшце, гэта ж тыповая сітуацыя, калі невялікі лэйбл праз час перадае альбо прадае свайго артыста так званым мэйджарам. Але фэст і не "чароўная пігулка", якая нешта гарантуе. Тут мала даць дыск — трэба пісаць, прасіць водгук, мець зносіны…

— Беларусь упершыню ўлілася ў форум?

— За апошнія пяць гадоў там быў толькі адзін беларускі артыст — праект Дзмітрыя Лук'янчыка "Folkmashina". Так што, фактычна, масава мы адкрылі для сябе гэты фестываль толькі цяпер. На ўдзел у ім ад нашых музыкантаў прыйшло 70 заявак, арганізатары адабралі чатырох выканаўцаў — гурты "Super Besse", "Петля пристрастия", "Devil Dandies" і "Ветах", але апошні з-за хваробы вакалісткі так і не даехаў да Таліна. Вынікам жа стала тое, што "Super Besse" запрасілі з канцэртамі ў Латвію, а "Петля…" зацікавіла эстонцаў. І гэта прытым, што абодва калектывы — рускамоўныя.

— Дык што, у першую чаргу патрэбен якасны прадукт, і не важна, на якой ён мове?

— Сусветная поп-індустрыя стаіць на англійскай мове, гэта кожны ведае. Але на індзі-ўзроўні, няхай гэта будзе рок ці поп, могуць мець пэўную вядомасць неангламоўныя выканаўцы. Таму я не выключаю таго, што беларускамоўны творца будзе запатрабаваны на Захадзе, хоць бы зыходзячы са свайго вопыту зносін з тамтэйшымі спецыялістамі, цікавасць у якіх больш выклікае наша інструментальная, электронная музыка, а таксама і этна. Музычны рынак сёння настолькі варыятыўны, што нішу знайсці можна — малазанятую, а то і сапраўдную лакуну. Для гэтага, так, патрэбен прадукт (не важна, рок гэта акажацца або не рок) ды захады для яго раскруткі. У нас жа артыст выпусціць дыск і чакае, што зараз на яго зваляцца запрашэнні даваць канцэрты. А яго не запрашаюць, таму што выканаўца "забыўся" апавясціць пра альбом хоць бы беларускую грамадскасць…

На адной з пляцовак "Tallinn Music Week".

Дзмітрый Безкаравайны:
"Я не выключаю таго, што беларускамоўны творца **будзе запатрабаваны** на Захадзе... Цікавасць там выклікае наша інструментальная, электронная музыка, а таксама часам і этна. Музычны рынак сёння настолькі варыятыўны, што нішу знайсці можна — малазанятую, а то і сапраўдную лакуну. Для гэтага, так, патрэбен прадукт ды захады для яго раскруткі".

— Што для сябе карыснага вынес з "Tallinn Music Week"?

— Як краінам, якія знаходзяцца быццам бы на перыферыі, у тым ліку сучаснай некамерцыйнай музыкі, пазіцыянаваць сябе і дзейнічаць у гэтым кантэксце. Якія спосабы ды магчымасці існуюць для прарыву калі не ў сусветны, дык у еўрапейскі шоу-бізнес — у дадзеным яго праламленні. І разуменне таго, што наша музыка ні каліва не горшая за тую, што ёсць у суседніх краінах (пра гэта мне, дарэчы, шмат казалі на фе+стывалі самыя розныя людзі). І тое быў не дзяжурны камплімент. Пытанне ж — толькі ў прасоўванні тавару. І паездкі з выступленнямі па нямецкіх барах, акрамя, магчыма, нейкай капейчыны, мала што дадуць у плане прамоцыі. Мне бачыцца вельмі фантастычнай сітуацыя, каб на канцэрт у еўрапейскую глухмень нейкім неверагодным спосабам трапіў менавіта той чалавек, які шукае "свежую кроў", і гэтай крывёю для яго стаўся той самы артыст. Па клубах — гэта добра, але важна ехаць туды, дзе збіраюцца спецыялісты.

— А наш шоу-бізнес — прамоўтары, прадзюсары ды іншыя менеджары — праігнараваў імпрэзу, пра якую мы гаворым. Як і Міжнародную канвенцыю "Colisium", што прайшла ў Мінску: важкіх гульцоў на рынку там было з пяцёра...

— Напэўна, яны пра шоукейс не ведаюць... А мо лічаць сябе падкаванымі ў тых пытаннях, якія абмяркоўваліся ў Таліне. Камусьці сапраўды абодва гэтыя фарматы былі не патрэбны. А калі сур'ёзна, то адна з нягод айчыннага шоу-бізнесу якраз у тым, што многім нашым менеджарам, прамоўтарам ды артыстам бракуе актуальных ведаў па працы ў сучасным шоу-бізнесе. Вучыцца яны, можа, і хочуць, але нічога для гэтага не робяць. Мне здаецца, па меры з'яўлення вынікаў ад падобных імпрэз цікавасць да апошніх вырасце...

— І паставім тлустую кропку. У каго больш шанцаў зацікавіць заходняга прамоўтара/прадзюсара: у Ані Шаркуновай або ў гурта "LiteSound"?

— Шанцаў, лічу, аднолькава мала. Мэйнстрымавая музыка павінна быць суперцікавай, каб на яе звярнулі ўвагу, суперпрафесійна запісанай, а гэта, перш за ўсё, — бюджэт. Шаркунова і "LiteSound" — усё ж такі лакальныя аналагі пройдзеных у свеце рэчаў. Я ўсё ж паставіў бы на беларускія індзі і альтэрнатыву — гэта ніша, у якой больш акцэнтаў на арыгінальнай музыцы, а не на тэхналогіях...

К

Рэйтынг ідэй са Швецыі і Беларусі

Квест і сэнсар

Хто ў дзяцінстве не хацеў дакрануцца да таемнага, зазірнуць у напластаванні эпох і стагоддзяў? Дзякуючы новым тэхналогіям ды крэатыўнаму падыходу да музейнай справы гэтыя памкненні становяцца рэальнымі.

Кастусь АНТАНОВІЧ

Так, новы праект у стакгольмскім Музеі старажытнасцей Міжземнамор'я і Блізкага Усходу з дапамогай 3D-мадэлей і гіганцкага сэнсарнага экрана дазваляе наведвальнікам трапіць унутр старажытнага саркафага. Дасягнуць жаданага эфекту "пранікнення" ў аўтараў экспазіцыі атрымалася дзякуючы выкарыстанню камп'ютарнай тамаграфіі.

У якасці стала выступае велізарны сэнсарны экран, які дазваляе наведвальнікам разгарнуць лічбавую копію забальзамаванага цела, што належала егіпецкаму жрацу. Перад гасцямі музея, якія самі кіруюць зменай малюнкаў на экране, па чарзе з'яўляюцца ўсе напластаванні, у якія мумія была "загорнута" — ад саркафага да рэшткаў цела. Можна паглядзець мадэль з любога боку, наблізіць асобныя ўчасткі, каб лепш іх разгледзець.

Цікавы праект стартаваў і ў нашай краіне. Так, у Гродне з'явілася магчымасць накіравацца на пошукі скарбаў у Стары замак. Супрацоўнікі Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея распрацавалі квест-гульню "У пошуках скарбаў", разлічаную, у першую чаргу, на вучнёўскую моладзь. Згодна з правіламі, складаюцца каманды з 5-20 чалавек, якія прымаюць удзел у пазнаваўча-забаўляльнай гульні-падарожжы па музеі. Камандам прапануецца выконваць паэтапныя заданні, у выніку якіх яны змогуць знайсці скарб караля Рэчы Паспалітай Стэфана Баторыя, схаваны, паводле легенды, у Старым замку. У бліжэйшы час супрацоўнікі музея распрацуюць падобную гульню і для іншых узроставых катэгорый.

К


Так ажыццяўляюць праект у Швецыі.

Пасля таго, як вылецела птушачка.

Амаль дэтэктыў пра адну сям'ю ў часіну ліхалецця

І.Грынберг. "Фотаапарат зніклага ў 1941-м".

21 жніўня 1962 года рукі прэзідэнта ЗША Кенэдзі і лідара Краіны Саветаў Хрушчова ўжо цягнуліся да кнопак пуску ракет з ядзернымі зарадамі. Прычына: супрацьстаянне СССР і ЗША. Нагода: фотаздымак. У той дзень на стол Кенэдзі паклалі фота, зробленыя з самалёта. Здымкі нібыта сведчылі: на палубах савецкіх сухагрузаў, што везлі на Кубу, як мяркуецца, сельгастэхніку, яўна бачныя балістычныя ракеты, а на Кубе падрыхтаваны стартавыя пляцоўкі!..

...Калі раней рабілі фота, кліенту раілі: "Глядзіце ў аб'ектыў: зараз вылеціць птушачка!" Расповед пойдзе пра гісторыю, што здарылася —

Чэрвеньская выстаўка 2013 года ў Мінску, у Галерэі Міхаіла Савіцкага. Мастак Іосіф Грынберг разам з вучнямі прадставіў рэтраспектыву творчай дзейнасці. У цэнтры — жывапіснае палатно, на ім — чатыры аб'екты, і ў кожнага свой лёс: пакручасты — у мастака, трагічны — у падлетка, якога мастак малюе, заблытаны — у фотаздымка, неверагодны — у апарата "Фотокор". Трагічная гісторыя вялікай сям'і Баршаяў у гады нямецка-фашыцкай акупацыі, неверагодныя перапляценні людскіх лёсаў, самі прыгоды старога фотаапарата — усё заключана ў адзіным, зробленым гэтай камерай, фотаздымку падлетка.

■■■

На адвароце старых здымкаў майстар-фатограф запэўніваў кліентаў надпісам "Негатывы захоўваюцца". Наіўны чалавеча: тут войны, навала, ліхалецце, а ён гарантуе захаванне кавалачка шкла!..

Таму, вядома ж, не захаваўся негатыў згаданага здымка падлетка з беларускага пасёлка Ялізава. "Птушачка" з "Фотокора" вылецела ў чэрвені 1941-га. Яму, Ісаку Баршаю, што пазіраваў, было на той час 14 гадоў — і ўжо ніколі не будзе больш. Але якім цудам дайшоў гэты, ужо пажоўклы ды пакамечаны, здымак да нашых дзён?

У Ялізаве, пад Асіповічамі, у пасёлку шклозавода "Кастрычнік" жылі Іосіф і Сара Баршаі, з імі — дачкі Хая і Бэла, сыны Ісак і Міша. Хая — будучая маці будучага мастака Іосіфа Грынберга. Усе дарослыя Баршаі працавалі на шклозаводзе. На чэрвеньскую зарплату Хая купіла і падарыла малодшаму брату Ісаку апарат "Фотокор" — каштоўны па тых часах прэзент!

21 чэрвеня падлетак зрабіў адзінае фота: свой партрэт. Якім чынам? А да апарата дадаваўся спецыяльны гнуткі тросік, каб чалавек мог адзняць сябе сам. Адзіную шкляную пласціну — негатыў — ён пры чырвоным святле праявіў да патрэбнай фазы, высушыў, затым кантактным чынам перанёс выяву на фотапаперу, ізноў праявіў, замацаваў, высушыў… Тое, што падлетак, не маючы аніякага вопыту, ажыццявіў гэты шматпрыступкавы працэс, выглядае цудам. Але — факт! Падлетак Ісак цэлы дзень ганарыўся здымкам.

А раніцай пачалася вайна.

■■■

Хая неяк паспела эвакуіравацца з Асіповічаў у апошнім эшалоне. У пасёлак шклозавода Ялізава прыйшлі немцы. Узімку 14-гадовага Ісака, які выглядаў больш дарослым, акупанты кінулі ў кузаў машыны: забралі на работы ў Германію. Больш пра яго нічога ніколі не чулі. Дарэчы, ніхто з тых, каго тады забралі, у Ялізава не вярнуўся. Ісак даводзіўся б дзядькам будучаму мастаку Іосіфу, які народзіцца ў першы паваенны год...

А ў той "дзень хапуна" да Баршаяў прыбегла дзяўчынка Любачка — дачка іх знаёмай, беларускі Ніны Лысюк. Яе дом стаяў на ўскраіне пасёлка. Люба таропка, з хваляваннем, паведаміла: "Пачалася аблава, немцы хапаюць яўрэяў — усіх, хто трапіцца!"

Галавы радзіны — Іосіфа — дома не было. А Сара з дачкой Бэлай і сынам Мішам, кінуўшы хату, пабеглі на канец пасёлка: да Лысюкоў. Там трох Баршаяў гаспадыня хаты Ніна Якаўлеўна схавала ў сутарэнні.

Адзінае, што паспелі ўзяць з сабой Баршаі ўцякаючы, — дакументы і некалькі сямейных фота, у тым ліку "аўтапартрэт" падлетка Ісака, якога схапілі немцы. У Лысюкоўскім сутарэнні ўцекачы пражылі тры тыдні. За гэты час адзінага з Баршаяў — Іосіфа, які вярнуўся дадому, — разам з суседзямі-яўрэямі, работнікамі шклозавода, 21 студзеня 1942-га карнікі расстралялі за ваколіцай... Але неўзабаве немцы спахапіліся: а дзе ж астатнія жыхары баршаеўскага дома? Пачаліся роспыты, дазнанне, іх пачалі шукаць. Акупанты "прачэсвалі" ўсе дамы, адзін за другім, і ўжо падступаліся да ўскраіны пасёлка, да жытла Лысюкоў. Гаспадыня спужалася за сваіх дзетак — Любачкі з брацікам — і, даўшы Баршаям ежы, выправадзіла іх у лес.

Ісак і Хая Баршаі.

Там Сара з двума дзецьмі сустрэла партызанскі атрад. Іх туды прынялі, і тройка яўрэяў прабыла ў партызанах два з паловай гады, да самага вызвалення Беларусі ад захопнікаў...

Вайна раскалола радзіну. Хая ў эвакуацыі пра лёс маці, малодшых сястры і брата ды пра тое, што яшчэ адзін брат, Ісак, быў схоплены немцамі, даведаецца ўжо пасля вайны. І да скону ў 1972-м, сумуючы, Хая распавядала пра гаротны лёс сям'і, пра забранага немцамі і зніклага брата свайму сынку Іосіфу (ён народзіцца ў яе з афіцэрам Чырвонай Арміі Давідам Грынбергам у 1946-м)...

Але ў гэтай, не такой ужо рэдкай для Беларусі, радзіннай драме з часоў вайны, аказваецца, паралельна выбудоўваўся незвычайны, амаль фантастычны, сюжэт!..

■■■

Ні ў аднаго апарата ва ўсім свеце няма, пэўна, такой пакручастай "біяграфіі", як у гэтага, прэзентаванага Ісаку сястрой, "Фотокора" савецкай вытворчасці!

У Ялізаве, непадалёк ад Баршаяў, жыла сям'я з нямецкімі каранямі. Тут дакладна ўжо не памятаюць іх прозвішча: быццам бы Драгелі. Адно прыгадалі, што аселі ў Беларусі тыя "немцы" яшчэ з часоў Першай сусветнай вайны. Дадаўшы да прозвішча беларускае "-евіч", яны даўно ўраслі ў савецкае інтэрнацыянальнае асяроддзе. Як і Баршаі, працавалі тыя Драгелевічы на шклозаводзе. Але "новая ўлада" нагадала ім, што яны ўсё ж — немцы! І прапанавала-дазволіла з хат, пакінутых яўрэямі, браць якую заўгодна маёмасць...

Апавядае мастак Іосіф Грынберг:

— Яны ўзялі з дзядулінага, з нашага дома дзве чырвоныя капы-саматканкі і прэзентаваны маёй маці яе брату Ісаку апарат "Фотокор". Калі ў 44-м да Ялізава падыходзіла з баямі Савецкая Армія, суседзі Драгелі-Драгелевічы ўцяклі ў Германію разам з войскам акупантаў. Прыхапілі яны з сабой акурат і дзве нашы капы-саматканкі ды апарат "Фотокор"...

У гэтых рэчаў таксама будзе пакручасты, зусім дэтэктыўны, лёс, які раскрыецца ў паваенныя гады!..



І.Грынберг. "Мястэчка".

■■■

Працягвалася і гісторыя раздробленай на тры часткі сям'і Баршаяў.

Два з паловай гады Сара з дзецьмі правяла ў партызанскім атрадзе: прала бялізну, гатавала ежу, перавязвала параненых... Чым маглі дапамагалі ў лагеры партызанам і дзеці, якія, вядома ж, падрасталі, не па гадах сталеючы ў ліхалецце...

У 1944-м партызаны Баршаі засялілі сваю, разрабаваную вайной, хату. Прыехала з эвакуацыі Хая, узяла шлюб з дэмабілізаваным Давідам. Сын, які нарадзіўся ў іх у 1946-м, атрымаў імя па расстраляным немцамі дзядулі: Іосіф. Ён, стаўшы студэнтам Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута, за Ялізавам, на месцы, дзе загінулі і ягоны дзядуля, і суседзі-землякі, сам усталяваў сціплы, па ягоных тагачасных магчымасцях, помнік. Цяпер там — годны манумент.

Па заканчэнні вайны — па дамоўленасці СССР з саюзнікамі па антыгітлераўскай кааліцыі аб рэпатрыяцыі — усе савецкія грамадзяне павінны былі вярнуцца на радзіму, жадалі яны таго ці не. Часта — прымусова. Шмат хто з патэнцыйных рэпатрыянтаў, якія не прагнулі адразу ж трапіць у ГУЛАГ, заканчваў жыццё самагубствам...

Іосіф Грынберг:

— Вярнуліся з Германіі і Драгелі-Драгелевічы. Прыбылі з нейкай маёмасцю. І што дзіўна: прывезлі дзве нашы капы-саматканкі ды апарат "Фотокор"! Вярнулі гэтыя рэчы маім бацькам ды бабулі Сары. А ў нас жа захаваўся той самы здымак майго дзядзькі, няшчаснага 14-гадовага Ісака! Гэта цяпер не проста рэчы, а рэліквіі нашай сям'і...

■■■

Чалавек заўсёды імкнецца трапіць туды, дзе, як яму здаецца, будзе жыцца лепш. А тым больш, калі асоба гэтая — мастак, істота, якая заўсёды знаходзіцца ў пошуку нечага новага. Да 1992-га маці беларускага жывапісца Іосіфа Грынберга не было на свеце ўжо дваццаць гадоў. І ён вырашыў падацца ў Ізраіль — на пастаяннае месца жыхарства. Гэта яму так тады здавалася...

Узгадвае Іосіф Грынберг:

— Вядома ж, я ўзяў з сабой сямейныя рэліквіі, у тым ліку адзінае фота дзядзькі Ісака, старэйшым за якога я ўжо тады быў у чатыры разы. Прыхапіў і старэнькі "Фотокор". Музею памяці ў Іерусаліме я прапанаваў гэтыя рэчавыя рэліквіі ў якасці экспанатаў у раздзел Халакосту…

Але дарагія мастаку рэліквіі там аказаліся не патрэбны — у музей узяць іх адмовіліся. За два дзесяцігоддзі ён здолеў пераканацца, што там, як прызнаўся, існуюць два крытэрыі ацэнкі таго ж жывапісу: "Прыгожа — непрыгожа" і "Колькі каштуе?". Мастак прыняў рашэнне перабрацца — ізноў жа, на ПМЖ — у Беларусь, на радзіму. Акрамя створаных у Ізраілі работ ён, канешне ж, прывёз і адзінае фота дзядзькі-падлетка, і легендарны фотаапарат-вандроўнік...

Іосіф Грынберг:

— Толькі тут я зразумеў, што наша сямейная сага — сюжэт для жывапіснага палатна! Так нарадзілася карціна, якая адкрывала маю першую па вяртанні ў родны Мінск выстаўку...

Вось яна — чатыры аб'екты, і ў кожнага — свой лёс: пакручасты — у мастака, трагічны — у падлетка, якога мастак малюе, заблытаны — у фотаздымка, неверагодны — у апарата "Фотокор". Карціну, фотаапарат і той здымак мастак мае намер перадаць у абноўлены Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Мае працяг і ўчынак жыхаркі пасёлка Ялізава беларускі Ніны Якаўлеўны Лысюк, што ў дні ліхалецця ўратавала Баршаеў: у Ізраілі гэта палічылі подзвігам, і ў яе гонар у Алеі Праведнікаў у Іерусаліме пасаджана дрэва.

■■■

Каб тыя, хто пазіруе перад апаратам, сядзелі нерухома, фатограф у даўніну заклікаў: "Глядзіце ў аб'ектыў: зараз вылеціць птушачка!"

Шчоўкае затвор апарата — і "птушачка вылятае"! Што адкрые ці зменіць фотаздымак? Таямніцу Сусвету? Лёс кожнага з нас?..

Уладзімір АРЛОЎ,
кінарэжысёр

Якія вобразы ўзнікаюць перад намі пры згадванні Першай сусветнай вайны? Выявы спаленых паселішчаў? Сем'яў, што не маюць прытулку? Салдат, якія ў процівагазах праводзяць ачыстку акопаў пасля газавых атак? Жанчын, якія плачуць над магіламі сына, мужа, брата? Хлопчыка, што ўжо носіць маленькі ваенны мундзір?.. Мяркую, для наведвальнікаў выстаўкі "Беларусь у Першай сусветнай вайне", якая ладзілася ў Нацыянальным гістарычным музеі Беларусі, тыя пытанні маюць дакладныя адказы. Для многіх, мяркую, убачанае там сталася адкрыццём. Нагадаем, у фарміраванні экспазіцыі задзейнічаны матэрыялы з фондаў пяці музеяў рэспублікі і двух прыватных збораў. Невыпадкова наступны яе крок — падарожжа па музеях суседніх краін.

Невядомы аўтар. Бліндаж. Фота № 14 з альбома І.Стаброўскага. Заходні фронт, 1915 — 1917 гг.

І.Сербаў. Выбранка (Каця Барысевіч, 17 гадоў) з этнаграфічнай экспедыцыі. Слуцкі павет, 1912 г.



Невядомы аўтар. Маленькі бежанец, які страціў бацькоў. Фота № 258 з альбома І.Стаброўскага. У ваколіцах Оршы (?), 1915 — 1917 гг.

Аблічча Першай сусветнай

Не эксплуатуючы страшныя выявы вайны...

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Бежанства

Пад час Першай сусветнай на землях Беларусі знаходзіўся больш як мільён бежанцаў. Гэты факт для многіх даследчыкаў ужо страціў сваю ўражальнасць, але калі бачыш аблічча людзей на фатаграфіях — абарваных, змучаных, брудных, без прытулку, — перажыванне гэтай трагедыі набывае новую сілу.

— Згодна з указам цара людзі павінны былі сыходзіць са сваіх месцаў, каб не пакідаць "жывой сілы", — згадвае гісторыю куратар выстаўкі Аляксей Шынкарэнка. — У выніку спалены і знішчаны сотні населеных пунктаў. Людзі, якія засталіся без прытулку, не ведалі, куды ім ісці, як жыць далей. На тэрыторыі Беларусі разгарнулася сапраўдная катастрофа...

Убачыць маштабы гэтай трагедыі можна дзякуючы фатаграфіям Сяргея Фёдарава з фондаў Нацыянальнага гістарычнага музея, які пакінуў унікальныя сведчанні пра лагер бежанцаў у Слуцку.

— Ваенны зафіксаваў і той момант, калі праз месяцы пачалі з'яўляцца адмысловыя пункты дапамогі, было створана Таццянінскае таварыства, аналаг Чырвонага Крыжа, — удакладняе куратар. — Але для мяне неверагодным па сіле з'яўляецца здымак, у цэнтры якога — хлопчык у зношаным салдацкім адзенні. Тут бачна ўсё. Людзі не маюць анічога: ні адзежы, ні ежы, ні лекаў… Спяць і ядуць на зямлі. Гэта былі паўгода хаосу ды недарэчных смерцяў, калі звычайная драпіна, атрыманая ў падобных умовах, магла забіць чалавека...

Бежанцы жылі ў палях, начавалі ў канавах, на голым месцы. Натоўпы няшчасных рухаліся па тэрыторыі беларускага краю, "аб'ядаючы" ацалелыя населеныя пункты. У выніку жыхары апошніх станавіліся падобнымі да першых...

Розніца ў поглядах

Наступны падраздзел, які працягвае экспазіцыю — "Паміж жыццём і смерцю", — складаецца са здымкаў палкавога фатографа рускай арміі, настаўніка Рамана Салаўя з фондаў Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, а таксама — з фатаграфій рускага афіцэра, археолага, краязнаўцы (ды заснавальніка Слонімскага раённага краязнаўчага музея) Іосіфа Стаброўскага.

— Калі казаць пра асаблівасць здымкаў яго альбома, — зазначае Аляксей Шынкарэнка, — яны ўражваюць менавіта адкрытасцю. Варта адзначыць, што здымкі, зробленыя фатографамі тых часоў, зусім не падобныя да фота сучасных рэпарцёраў, — выяўляе Аляксей розніцу ўспрымання, — калі выява смерці часам эксплуатуецца. Удзельнікі "вялікай вайны" не імкнуліся паказваць кроў, у іх здымках — амаль што "звычайная" дакументалізацыя смерці. І гэта тым больш шакуе...

М.Гаген. Ваенны, які назірае за выбухам. Фота № 90 з альбома штабс-капітана рускай арміі М.Гагена. Заходні фронт у раёне Шчары, 1915 — 1916 гг.

С.Фёдараў. У лагеры бежанцаў. Слуцк, 1915 г.

Куратар звяртае ўвагу на фота загінулых пасля газавых атак з альбома Стаброўскага. Яно ўражвае: твары мёртвых на ёй накрыты капуснымі лістамі...

— Падобных адбіткаў у альбоме афіцэра дастаткова, але я выбраў для выстаўкі той, дзе ў кадры побач з загінулымі ёсць жывыя — хлопчык і бывалы салдат, — кажа куратар. — Мяне ўразіла скруха апошняга, які аплаквае сваіх таварышаў, і спакой хлопчыка, які глядзіць на ўсё гэта нібыта звыклым поглядам. Кантраст — вось што падалося страшным. Мы заўважаем, як рэагуюць на смерць сведкі часу...

Фатаграфіі Рамана Салаўя таксама паказваюць аблічча смерці, але робіцца гэта з належнай дыстанцыі: на адным з фотаадбіткаў я заўважыла ледзь прыкметнае цела нямецкага салдата.

— Тут і не зразумееш, што адбываецца. Пэўная шэрасць, якая забірае жыццё. І гэты здымак нагадаў цыкл вядомай амерыканскай фотамастачкі Салі Ман "Што застаецца?", дзе яна здымала чалавечыя астанкі, — кажа Шынкарэнка.

Куратар не адмаўляе, што многія работы ён "прачытвае" вачыма сучаснага гледача, знаходзячы рэфрэны ў класічнай ды сучаснай фатаграфіі. І гэты досвед дапамагае экспазіцыі, задаючы мастацкі кантэкст прачытання здымкаў.

Захоп ідэнтычнасці

Кульмінацыяй становіцца раздзел "Зямля OberOst", які распавядае пра перыяд акупацыі беларускіх земляў. Каб паказаць гэты малавядомы для шырокай публікі перыяд, стваральнікі выстаўкі зрабілі акцэнт на дакументах з выкарыстаннем фатаграфіі — пашпартах, якія выдавалі немцы беларусам. Іх узоры прадстаўлены Лідскім гісторыка-мастацкім музеем.

Разварот пашпарта 1917 г., выдадзенага кайзераўскімі ўладамі.

— У дакументах пазначаліся імя, прозвішча, дата нараджэння, родная мова, рэлігія, прыкметы, — апісвае куратар артэфакты. — Але незвычайнае ў іх — партрэты. Чалавек паказаны ў поўны рост, і пры гэтым ён — сядзіць. Знаёмы нам "паплечны" пашпартны варыянт выявы з'явіцца пазней...

Як чытаць кантэкст? Інтэрвенцыя вайны адбываецца на іншым узроўні: захопліваюцца не толькі землі, але і ідэнтычнасць чалавека.

— На нашу ідэнтычнасць накладваюцца іншыя знакі, — доўжыць думку Аляксей Шынкарэнка. — Мы бачым нашы гарады і вёскі, якія падпісваюцца на іншай мове. Ды імёны і прозвішчы, постаці атрымліваюць новыя пазначэнні...

І развіваючы ідэю, раздзел дапаўняюць фота, зробленыя нямецкімі салдатамі. Напрыклад, "ідылічная карціна": кайзераўцы гуляюць з беларускімі дзецьмі, цягнучы дзіця ў "экзатычным" драўляным вазку. Стасуюцца з беларускімі дзяўчатамі. Мірна сядзяць на пагорках… Але ж пэўная дзіўнасць фотаздымкаў у тым, што глядач адчувае амаль незаўважную, але істотную прысутнасць чужога. Нават калі ён выглядае нібыта "як і ўсе".

Экспазіцыя заканчваецца раздзелам "Перамір'е". Вайна, якая зацягнулася, для многіх яе ўдзельнікаў страціла свой сэнс. На тварах салдат — стомленасць і разгубленасць: ніхто ўжо не разумее канчатковай мэты супрацьстаяння. Факты братання і спробы перамір'я. Тэатр, у якім акцёры стаміліся выконваць свае ролі. Выхад на сцэну і новых гульцоў — бальшавікоў.

— Фінальным здымкам экспазіцыі можа быць гэты, дзе маленькі бежанец, які страціў сваіх бацькоў, ужо апрануты ў ваенны мундзір, — завяршае расповед Шынкарэнка. — А можа, і той, што зрабіў нямецкі салдат, які захаваў на памяць выяву тутэйшай жанчыны з дзецьмі...

Стваральнікі выстаўкі ўказалі на яшчэ адну дэталь: амаль кожны раздзел займеў падтрымку ў выглядзе элемента беларускага арнаменту, які быў рэканструяваны ў адпаведнасці з тэмай. Атрымаўшы кансультацыю ў Веткаўскім музеі стараверства і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава, яны дазволілі сабе па-новаму трактаваць вядомыя сімвалы, даючы дадатковы кантэкст для ўспрыняцця фатаграфіі і нашай гісторыі.

К

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:

■ Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.

■ Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.

■ Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.

■ Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.

■ Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:

■ **Вялікая імператарская карона Расійскай імперыі** (рэпліка, выкананая майстрамі ювелірнай групы "Смаленскія брыльянты") — да 21 красавіка.

■ Творы старажытнарускага ліцавога шыцця **"Жывапіс іголкай"** — да 25 мая.

■ Жывапіс **Канстанціна Качана і Уладзіміра Кожуха** — да 28 красавіка.

■ Выстаўка аднаго твора — габелена "Падрыхтавацца Волкаву!" На зборах" Ігара Уласава — да 25 мая.

■ Выстаўка **"Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі"** — да 10 ліпеня.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.

■ Пастаянныя экспазіцыі: **"Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча".**

■ Тры новыя партрэты ў экспазіцыі **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".**

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Персанальная выстаўка майстра разьбы па шкарлупіне яйка Аляксандра Рыжэўскага — да 2 чэрвеня.

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37. Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

■ Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:

■ **"Старажытная Беларусь"**.

■ **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы"**.

■ **"Банк БелВЭБ: новае жыццё нацыянальных скарбаў"**.

Выстаўкі:

■ Выстаўка **"Іосіф Гашкевіч — дыпламат, вучоны-арыенталіст (да 200-годдзя з дня нараджэння)"** — да 25 мая.

■ Выстаўка графікі беларускіх мастакоў 1920-х — 1930-х этнаграфічнай тэматыкі са збораў музея **"І рай і боль на Песеннай зямлі..."** — да 20 красавіка.

ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДА РСДРП



г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстаўка **"Гісторыя ў кашальку"**.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02; + 37529 551 80 51, +37529 190 31 49.

Палацавы ансамбль:

■ Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:

■ Выстаўка "Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. XXI стагоддзе" (Санкт-Пецярбург) **"Жывапіс. Скульптура. Графіка"** — да 25 красавіка.

■ Выстаўка **"Народныя лялькі-абярэгі"** — да 25 мая.

Інфармацыйна-касавы цэнтр:

■ Выстаўка фота Галіны Ламака **"Паміж мінулым і будучым"** — да 30 красавіка.

Ратуша:

Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

■ Пастаянная экспазіцыя.

■ Выстаўка фатаграфій **"Мір стары — Мір новы"**.

Слановая зала

■ Выстаўка з прыватнай калекцыі І.Сурмачэўскага **"Дух часу і раскошы: мода і стыль 1820 — 1920-х гадоў"** — да 31 мая.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

Экспазіцыя:

■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.

■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.

■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам для школьнікаў малодшага ўзросту.

Акцыі:

■ **"Самы лепшы дзень"** (Дзень нараджэння ў музеі).

■ **"У дзень вяселля — у музей!"** (па папярэдняй дамоўленасці).

■ Музейная творчая майстэрня (майстар-клас па вырабе цацак з салёнага цеста).

Выстаўкі:

■ **"Пуцявінамі Якуба Коласа"** — да 30 красавіка.

■ Выстаўка работ Івана Міско **"Зорнае неба"** — да 24 красавіка.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

Экспазіцыя:

■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.

■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі", "Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.

Выстаўка:

■ Выстаўка-прэзентацыя герба роду Луцэвічаў **"Нівіна"** і выстаўка дробнай пластыкі **"Збор рыцараў Сярэднявечча"** з прыватнай калекцыі літоўскага скульптара Даруса Міляўскаса — да 6 мая.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

Выстаўкі:

■ Персанальная выстаўка Ю.Герасімовіча **"Веснавыя матывы"**.

■ Выстаўка **"Партызанскі лагер"**.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА

г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10.

Філіялы Музея гісторыі горада Мінска:

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА

г. Мінск, пл.Свабоды, 15. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыі:

■ **"Мінск губернскі. Дваранскі побыт".**

■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой".** Прысвечана Герою Беларусі, народнаму мастаку Беларусі, Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.

Выстаўка:

■ Персанальная выстаўка заслужанага мастака РФ Нікаса Сафронава — да 5 мая.

МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША

г. Мінск, пл.Свабоды, 2а. Тэл.: 321 24 30.

Экспазіцыя:

■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет".**

ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ

г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10. Тэл.: 285 18 86.

Экспазіцыя:

■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры к. XIX — с. XX стст.

ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА

г. Мінск, пр-т Ракасоўскага, 49. Тэл.: 291 16 76.

Экспазіцыі:

■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Л.Шчамялёва".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:

■ *Упершыню на Беларусі!* **"Цмокі і васковыя фігуры"** (скульптуры драконаў і герояў фэнтазі, а таксама гістарычныя персанажы царскай сям'і Раманавых) — да 29 чэрвеня.

■ **"Спадарыня Лялька"** (выстаўка работ майстроў аўтарскай лялькі з Мінска, Магілёва, Гродна, Гомеля і Вільнюса) — да 11 мая.

■ Выстаўка ткарлікавых дрэваў **"Бансай — музыка, застылая ў вецці"** — да 21 чэрвеня.

■ Выстаўка арыгінальных дакументаў, фатаграфій, прадметаў з фондаў музея "Гомельскі палацава-паркавы ансамбль", што апавядаюць гісторыю перыяду існавання Гомельскай губерні ў 1919 — 1926 гг., **"Гомельская губерня — 95"** — з 25 красавіка.

■ Выстаўка насякомых **"Скульптура прыроды"** — да 4 мая.

■ Арт-праект **"Парачкі"** (фотаработы, прысвечаныя Дню закаханых, на агароджы гомельскага парку) — да 28 красавіка.

■ **"Ілюстрацыі да гісторыі беларускай..."** (неафатаграфічныя работы В.Раковіча) — да 20 красавіка.

■ Выстаўка **"Светлае Хрыстова Уваскрэсенне"** — да 11 мая.

Экспазіцыі:

■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).

■ **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).

■ Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.

■ **"Чырвоная гасцёўня".**

■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў".**

■ Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).

■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).

Вежа палаца

Экспазіцыя:

■ **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:

■ **"Створаныя эпохай Румянцава"** (літаратурная выстаўка 2-й пал. XVIII — 1-й чвэрці XIX стст. са збору графа М.П. Румянцава).

■ **"Класікі беларускага мастацтва".**

Паўночнае крыло палаца

Экспазіцыя:

■ **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:

■ Куток жывых экзатычных рэптылій.

Зімовы сад

Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16. Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:

■ **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).

■ **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўкі:

■ **"Вестачка да свята"** (віншавальныя паштоўкі канца XIX — пачатку XX стагоддзя).

■ **"Гісторыя аднаго парахода"** (прасы XVII — XX стст. з калекцыі А.Ярша).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.

■ Пастаянная выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.

■ Выстаўка **"Спякотнымі дарогамі Афганістана"**, прысвечаная 25-годдзю выводу савецкіх войск з Афганістана.

■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.

■ **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

■ Экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:

■ **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна..."**.

■ **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст."**.

■ Выстаўка адной карціны **"Партызаны"**.

■ **"Прывітанне, ранейшая Ліда!"**.

■ **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**

■ Турыстычна-пазнавальная праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1. Тэл.: 327 26 12.

■ IX Міжнародная выстаўка жывапісу і графікі дзяцей і моладзі **"На сваёй зямлі"** — да 23 красавіка.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 288 15 49.

■ **"Лабірынты жанру"** (жывапіс) — да 15 мая.

■ Персанальная выстаўка работ Ганны Горавай **"Касмічнае падарожжа"** — да 25 красавіка.

■ Дзіцячая мастацкая выстаўка **"МЧС"** — да 25 красавіка.

ШТОТЫДНЁВАЯ МАСАВА-ПАЛІТЫЧНАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года

Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ

Рэдакцыя
Рэдактары аддзелаў:
Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН
Аглядальнік рэдакцыі: **Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ,**
Спецкарэспандэнты: **Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Вольга НАВІЦКАЯ**
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — **Юрый ІВАНОЎ**
Мастацкі рэдактар — **Наталля ОВАД**
Карэктар — **Інга ЗЕЛЬГІС**

Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290 22 50, (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон-факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
*Матэрыял на правах рэкламы.

"Культура", 2014.
Індэксы 63875, 638752
Рознічны кошт — па дамоўленасці.
Наклад 6775
Падпісана ў друк 18.04.2014 у 16.00
Замова 1547
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва" 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Прыёмная: (017) 290 22 50.
Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35

QR-код:

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1. Тэл./факс: 334 11 56.

■ **19** — **"Рамэа і Джульета"** (балет у 2-х дзеях) С.Пракоф'ева. Пачатак а 19-й.

■ **22** — **"Тоска"** (опера) Дж.Пучыні.

■ **23** — **"Дон Кіхот"** (балет у 3-х дзеях) Л.Мінкуса.

■ **24** — Канцэрт **"Казкі Венскага лесу"**. Пачатак а 19-й.

■ **24** — Канцэрт да 195-годдзя з дня нараджэння Станіслава Манюшкі — Музычныя вечары ў Вялікім (Камерная зала імя Л.П. Александроўскай). Пачатак у 19.30.

■ **25** — Канцэрт **"Штраус запрашае"**. Пачатак а 19-й.

■ **25** — **"Прынашэнне майстру"** — юбілейны вечар Л.С. Талкачовай. Пачатак у 19.30.

■ **26** — **"Травіята"** (опера ў 3-х дзеях) Дж.Вердзі.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 327 60 81.

■ **19** — **"Паўлінка"** Янкі Купалы.

■ **20** — **"Вечар"** А.Дударава.

■ **22** — **"Чорная панна Нясвіжа"** А.Дударава.

■ **23, 24** — **"Местачковае кабарэ"**.

■ **25** — **"Офіс"** І.Лаўзунд.

■ **26** — **"Пан Тадэвуш"** А.Міцкевіча.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

■ **19** — **"Бегчы з Эльсінора, або Гамлет навыварат"** В.Понізава.

■ **21** — **"Эмігранты"** С.Мрожака.

■ **22** — **"Кантракт"** Ф.Вэбера.

■ **24** — **"Нямое каханне"** — аўтарскі праект Ігара Сігова.

■ **26** — **"Чарнобыльская малітва"** (драма) С.Алексіевіч.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

■ **19** — **"Чароўная лямпа Аладдзіна"** (мюзікл для дзяцей і дарослых) М.Самойлава. Пачатак у 11.30.

■ **19** — **"Соф'я Гальшанская"** У.Кандрусевіча. Пачатак а 19-й.

■ **22** — **"Мая жонка — ілгуння"** В.Ільіна, В.Лукашова.

■ **23** — **"Бабін бунт"** Я.Пцічкіна.

■ **24** — **"Тысяча і адна ноч"** (аперэта ў 2-х дзеях) Фікрэта Амірава.

■ **25** — **"Юнона" і "Авось"** А. Рыбнікава.

■ **26** — **"Залатое кураня"** (мюзікл для дзяцей у 2-х дзеях) У.Уланоўскага. Пачатак у 11.30.

■ **26** — **"Містар Ікс"** (аперэта ў 2-х дзеях) І.Кальмана. Пачатак а 19-й.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

Свята Беларускага тэатра "Лялька":

■ **19** — **"Тук-тук! Хто там?"** Л.Ралчава. Пачатак аб 11-й.

■ **19** — **"Нататкі вар'ята"** паводле М.Гогаля. Пачатак а 19-й.

■ **20** — **"Цудоўная скрыня з зялёным гарошкам"** па матывах шведскіх казак. Пачатак а 14-й.

Тэатр "Паўночная сцэна" (г. Новы Урэнгой, Расія):

■ **20** — **"Спячая прыгажуня"**. Пачатак аб 11-й.

■ **21** — **"Падарожжа па порах года"**. Пачатак аб 11-й.

■ **23, 24, 25, 26** — **"Прынцэса і свінапас"** Х.-К. Андэрсена. Пачатак у 10.30 (23, 25), аб 11-й (26) і а 13-й (24).